Камуністычная партыя (бальшавікоў) Беларусі

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і МГК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

МАЙ 10 1933 г. № 101 (4645)

Год выданьня XVI

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Сеньня у нумары

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Тварам да задач уздыму с.-г. вытворчасьці. Х. ДУНЕЦ — Больш увагі тэатральнаму фронту БССР (2 стар.). П. ЛАЗАРЭВІЧ — Увага падсочцы сасны (4 стар.). ШАЎРОЎ — Супроць спэкуляцыйна-ізпманскіх тэндэнцый у гандлёвым апараце (3 стар.).

У КП(б)Б (2 стар.).

М. ЕКЕЛЬЧЫК—Да чаго прывяла адсутнасьць клясавай пільнасьці МТС АБАВЯЗАНЫ ЎЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ СЯЎБЫ (3 стар.).

ЗА МЯЖОЙ:

Дырэктар Штутгардзкага аддзяленьня «Дэропу» пасаджан у канцлягер (1 стар.).

Замежны друк аб італа-савецкай гандлёвай згодзе (1 стар.)

Тварам да задач уздыму с.-г. вытворчасьці

БССР уступіла ў рашаючы пэрыяд палявых работ. Ад далейшага пяўхільнага ўзмацненьня тэмпаў сяўбы, ад максымальнага паляпшэньня якасьці работы залежыць посьпех галоўнага бою—бальшавіцкай сяўбы першага году другой пяцігодкі.

Вялізарную адказнасьць за ход сяўбы нясе спажывецкая кааперацыя. Разгортваньне таваразвароту на вёсцы, правільная пастаноўка работы пізавой сеткі мае выключнае значэньне для пасьпяховага правядзеньня вёснавой пасеўнай кампаніі, для ўмацаваньня калгаснага ладу.

Ня можа па-сапраўднаму, па-бальшавіцку працаваць тая кааперацыйная арганізацыя, якая разглядае сябе ізалявана ад задач умацаваньня калгаснай вытворчасьці, ад задач пераможнага завяршэньня сяўбы.

Усебеларускі конкурс на лепшае сельскае спажывецкае таварыства, які зараз праводзіцца, павінен зрабіць рашаючы пералом у перабудове работы вясковай кааперацыі, у абслугоўваньні ёю пасеўнай кампаніі.

Конкурс ставіць перад спажывецкай сыстэмай БССР рад адказьнейшых задач:

— **Правільна арганізаваць тавараснабжэньне, ліквідаваць абязьлічку ў гэтай справе і гэтым зрабіць уплыў на ход палявых работ.** Лепшыя тавары—лепшым ударнікам, тавары байкот лодырам—вось аснову прынцып гандлёвай работы на вёсцы. Для гэтага трэба ўстанавіць правільныя каэфіцыенты тавараснабжэньня вёсак і калгасаў у строгай адпаведнасьці з колькаснымі і якаснымі паказальнікамі сяўбы.

— **Перанесьці ўвесь цяжар работы ў калгас, брыгаду, на поле, выразна і хутка прасоўваць тавары, стымулюючы ўдарную працу.** Для гэтага сельспажыўтаварыствы павінны быць цесна зьвязаны з сельска-гаспадарчай вытворчасьцю, з калгаснай брыгадай, дасканала ведаць выкананьне вытворчых заданьняў кожным вучасткам, паргола пагрузіцца ў калгасныя будні.

— **Усямерна дапамагчы калгасам у арганізацыі грамадзкага харчаваньня, у адкрыцьці палявых ачагоў, ясьляй і пляцовак, каб уцягнуць усіх жанчын у палявыя работы.**

Мы маем зараз рад перадавых сельспажыўтаварыстваў, якія працуюць бальшавіцкімі мэтадамі, канкрэтна, аперацыйна кіруюць работай крам, уваходзяць ва ўсе дэталі с.-г. вытворчасьці; яны паказваюць узоры работы па-новаму, у новых умовах.

Да гэтых сельспажыўтаварыстваў у першую чаргу адносяцца **Ціхініцкае** ССТ—Рагачоўскага раёну, **Серадзяноўскае**—Слуцкага. Яны зразумелі, што задачы вёснавой сяўбы, павышэньня ўраджайнасьці маюць самыя непасрэдныя адносіны да спажывецкай кааперацыі, у сваёй рабоце яны апіраюцца на шырокія масы пайшчыкаў.

На вопыце гэтых сельспажыўтаварыстваў трэба вучыцца ўменьню пераключаць усю сваю дзейнасьць па апамогу пасеўнай.

У кожным калгасе, брыгадзе, сярод працоўных аднаасобнікаў крамы выяўляюць лепшых змагароў за бальшавіцкую сяўбу і забясьпечваюць першачарговае прасоўваньне тавараў для іх снабжэньня.

Шырока скарыстоўваецца мэтад заключэньня сацыялістычна-вытворчых дагавораў паміж ССТ і калгаснай брыгадай. Гэтыя дагавары заключаюцца на ўвесь пэрыяд палявых работ, у іх указваюцца колькасныя і якасныя паказальнікі працы, абавязацельствы сельспажыўтаварыстваў і інш. Сыстэматычная праверка ажыцьцяўленьня гэтых дагавораў забясьпечвае іх дзейнасьць, як магутнага фактару ўздыму прадукцыйнасьці працы.

Штодзенна ў калгасы выяжджаюць развозкі з прамтаварамі. Гэтыя развозкі, на аснове працоўных кніжак, на аснове вынікаў работы, наладжваюць гандаль прамтаварамі непасрэдна на полі. Кожны развозчык, кожны латошнік увязвае продаж тавараў непасрэдна з ходам сяўбы. Ён сыгналізуе сельспажыўтаварыству, як выконваюцца вытворчыя заданьні.

Вялікія вынікі дае таварны байкот зрыўшчыкаў сяўбы—як калгасаў і вёсак, так і паасобных калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў.

Цікавы мэтад ужыло Палікарпаўскае ССТ Слуцкага раёну. Работнікі кааперацыі прымацаваны да калгасных брыгад. Да выхаду на работу прымацаваны работнік знаёміцца з заданьнем брыгады на дзень, абмяркоўвае гэта заданьне, заключае дагавор на выкананьне пляну і на продаж прамтавараў.

На канчэньні работ ён прымае ўдзел у разглядзе вынікаў працы, выяўляе лепшых ударнікаў і дае ім магчымасьць атрымаць тавары на месцы.

Факты паказваюць, што новыя мэтады тавараснабжэньня зьявіліся магутным вагаром уздыму с.-г. вытворчасьці, посьпеху сяўбы і разгортваньня таваразвароту.

Ціхініцкае сельспажыўтаварыства, напрыклад, ужо выканала больш 50 проц. пляну таваразвароту другога кварталу.

Аднак, у **большасьці раёнаў работа** па абслугоўваньні веснавой сяўбы не разгорнута. Некаторыя райсаюзы яшчэ не пакончылі са стадыяй «арганізацыі» і «плянаваньня». **Шыяўскі** райсаюз, напрыклад, яшчэ «мяркуе» адкрыць ларкі, арганізаваць сталоўкі. Зусім не вядзецца масавая арганізацыйная работа на лініі ССТ. У **Старобінскім** раёне не заключаны дагаворы з калгасамі і аднаасобнікамі, не наладжана грамадзкае харчаваньне ў калгасах. **Чырвонапольскі** райсаюз яшчэ займаецца праектамі і плянамі. **Любаньскі** абмежаваўся фармальным уключэньнем у конкурс. **Магілеўскі, Брагінскі, Хойніцкі** райсаюзы не пайшлі далей урачыстых дэклярацый. **Касьцюковіцкі** райсаюз правяў саноўна-панскія адносіны да кіраўніцтва ССТ, падмяніўшы жывы інструктаж камандаваньнем і цыркулярным кіраўніцтвам.

Поўную адказнасьць за гэта нясуць партыйныя арганізацыі пералічаных раёнаў, якія мала займаюцца пытаньнямі разгортваньня таваразвароту, ня кіруюць работай сельспажыўтаварыстваў і райсаюзаў. Трэба рубам паставіць пытаньне—**партарганізацыі, якія ня могуць скарыстаць ССТ, як вагар умацаваньня калгасаў, ня выконваюць дырэктыў партыі аб калгасным будаўніцтве, аб савецкім гандлі.**

У радзе раёнаў спажывецкая кааперацыя ігнаруе аднаасобны сэктар. Выразны прыклад агіднейшага скрыўленьня лініі партыі паказвае **Казловіцкае ССТ** (Случчына), дзе зусім спынілі водпуск дэфіцытных тавараў аднаасобнікам. Трэба браць прыклад з **Урэцкага** сельспажыўтаварыства, дзе заключан рад дагавораў з аднаасобнікамі, што значна дапамагло посьпеху палявых работ.

Неабходна памятаць, што ва ўмовах БССР аднаасобнікі побач з калгасным сэктарам вырашаюць посьпех пасеўнай. Таму спажывецкая кааперацыя павінна як мага больш увагі аддаць абслугоўваньню аднаасобнага сэктару, стымуляваньню шляхам пераважнага снабжэньня ўдарнікаў ходу сяўбы па аднаасобных гаспадарках.

Разгортваньне таваразвароту, продаж лепшым калгаснікам і аднаасобнікам тавараў добрай якасьці па ўстаноўленай цане, патрэбнага асартымэнту—важнейшая ўмова барацьбы за рэнтабэльнасьць вясковай кааперацыйнай сеткі. Гэта рэнтабэльнасьць ні ў якім разе не павінна быць дасягнута за кошт спэкуляцыйных накідак, а толькі за кошт зьніжэньня выдаткаў, росту таваразвароту, ліквідацыі затаварваньня. Усякія спробы пакрыць вялікія выдаткі, растраты, безгаспадарчасьць за кошт самавольнага павышэньня цэн, прымусова га асартымэнту, навязваньня тавараў дрэннай якасьці павінны сустрэць рэзкі адпор, як спробы, якія адлюстроўваюць буржуазна-нэпманскія спэкуляцыйныя тэндэнцыі ў кааперацыйным апараце.

Неабходна ачысьціць кааперацыйную сетку ад жульніцкіх, спэкуляцыйных, варожых элемэнтаў. Калі ў ССТ працуе адданы партыі чалавек, ён пераўтварае кааперацыю ў вагар умацаваньня калгасаў. У тых-жа сельспажыўтаварыствах і крамах, дзе ару дуе клясавы вораг, снабжаюць таварамі гультаёў, раскрадваюць грамадзкую маемасьць, замарожваюць тавар зварот.

На спажывецкую кааперацыю ўскладзена вялікая адказнасьць і за ход сяўбы ў прыгарадных гаспадарках. Каапгасы ў гэтым годзе павінны даць рабочаму спажыўцу дзесяткі тысяч тон дадатковых харчовых прадуктаў—гародніны, бульбы і інш.

Апошнія даныя гавораць аб тым, што прыгарадныя гаспадаркі значна адстаюць у ходзе сяўбы. Сяўба гародніны толькі пачалася. Пасеяна ўсяго толькі 6 проц. пляну. Каапгасы пя выканалі дырэктывы партыі і ўраду аб сканчэньні сяўбы аўса да 27 красавіка. На 5 мая засеяна 1.207 га аўса—48,2 проц. пляну. Справіліся з гэтай задачай толькі каапгасы менскіх ЗРК. Сарвалі заданьне прыгарадныя гаспадаркі **Магілева і Віцебску,** дзе праяўлена апартуністычная недаацэнка значэньня раньняй сяўбы, дзе падрыхтоўка да палявых работ праведзена выключна дрэнна.

Каапгасы павінны патроіць тэмпы сяўбы раньніх культур і выйсьці пераможцамі ў барацьбе за новыя дзесяткі тысяч тон гародніны.

Множыць рады ўдарнікаў кааперацыі! Ператварыць усебеларускі конкурс на лепшае ССТ у зброю перабудовы работы кааперацыі! Вось вялікія задачы, ускладзеныя на ўсе раённыя партыйныя, савецкія і кааперацыйныя арганізацыі.

ЦК КП(б)Б у сваёй пастанове па дакладах Царыкоўскай і Нізкаўскай парт'ячэек і сельспажыўтаварыстваў Касьцюковіцкага раёну даў разгорнутую праграму барацьбы за перабудову работы вясковай кааперацыі, за далейшае разьвіцьцё савецкага гандлю.

Дырэктывы **ЦК КП(б)Б** павінны быць пакладзены ў аснову ўсёй далейшай работы спажывецкай кааперацыі БССР.

ЗЬНЕШНЯ-ПАЛІТЫЧНАЯ ІЗАЛЯЦЫЯ ФАШЫСЦКАЙ ГЕРМАНІІ

Інтэрв'ю ваеннага міністра Блёмбэрга

БЭРЛІН, 8. (БЕЛТА). Згодна паведамленьня агенцтва «Вольфа», гэрманскі ваенны міністар у інтэрв'ю заявіў: «Жадаючыя прымусіць Германію ўвесьці новую ваенную міжнародную сыстэму на аснове французкіх прапаноў выпускаюць з-пад увагі сацыяльныя і іншыя патрэбы Германіі. Час, калі можна было дыктаваць, прайшоў. Як разбураная краіна, акружаная моцна ўзброенымі краінамі Эўропы, Германія асабліва зацікаўлена ў посьпеху канфэрэнцыі па разбраеньні і гатова згадзіцца на скарачэньне тэрміну ваеннай службы. Аднак, яна можа скараціць гэты тэрмін з 12 год да 8 месяцаў не адразу, а толькі паступова. Гэта тлумачыцца тым, што ў Германіі няма навучаных рэзэрваў. Германія зможа прывесьці арганізацыю сваёй арміі ў адпаведнасьць з ангельскімі прапановамі ў залежнасьці ад таго, як доўга і ў якой форме іншыя краіны прыпяняць свае ўзбраеньні ў адпаведнасьць з гэтымі прапановамі. У інтарэсах посьпеху канфэрэнцыі па разбраеньні, Германія гатова весьці перагаворы, але ні хоча падначальвацца ультыматумам».

***

БЭРЛІН, 9. (БЕЛТА). Інтэрв'ю ваеннага міністра БЛЁМБЭРГА аб пазыцыі германскай дэлегацыі на канфэрэнцыі па разбраеньні сьведчыць аб усё большым пагаршэньні міжнароднага становішча Германіі. Ня столькі зьмест, колькі сам факт раптоўнай заявы ваеннага міністра, зробленай адказнаму рэдактару афіцыёзнага агенцтва «Вольф», сьведчыць, наколькі сур'ёзна ва ўрадавых колах расцэньваецца зьнешня-палітычнае становішча Германіі.

Асаблівую трывогу выклікае пазыцыя Англіі. Ход падзей паказаў, што пазыцыя Англіі ва ўсіх асноўных міжнародных пытаньнях, і ў першую чаргу ў пытаньні разбраеньня, зусім не адпавядае надзеям, што ўскладаліся на Англію германскім урадам, які імкнуўся, як вядома, стварыць англа-германа-італьянскі блёк.

Лёндансні карэспандэнт «Франкфуртэр Цэйтунг» піша: «Настрой пёнданскай грамадзкасьці і ўрадавых колаў Англіі за апошнія тыдні зьмяніўся настолькі, што Германія служыць цяпер для ангельскіх палітыкаў і журналістаў казлом адпушчаньня за ўскладненьні ў работах канфэрэнцыі па разбраеньні».

Падкрэсьліваючы, што ангельскія ўрадавыя колы скарыстоўваюць ангельскі друк, каб указаць Германіі на небясьпеку яе поўнай зьнешня-палітычнай ізаляцыі, карэспандэнт «ФРАНФУРТЭР ЦЭЙТУНГ» піша, што для гэтай мэты ангельскі ўрад карыстаецца і іншымі сродкамі. Паводле слоў карэспандэнта, ангельская пасольства ў Бэрліне, як відаць, атрымала ўжо дырэктывы паставіць у вядомасьць германскі ўрад, што ангельская палітыка ў Жэнэве разыходзіцца з сучаснай пазыцыяй Германіі.

У такім-жа духу піша пёнданскі карэспандэнт «ДЭЙЧЭ АЛЬГЕМЭЙНЭ ЦЭЙТУНГ».

Няўдачы „місіі" Роззэнбэрга ў Англіі

Паведамленьне ангельскага міністарства замежных спраў

ЛЁНДАН, 9. (БЕЛТА). У сувязі з гутаркай РОЗЗЭНБЭРГА з тав. міністра замежных спраў ВАНСІТАРТАМ, міністэрства замежных спраў выпусьціла паведамленьне, у якім указваецца, што сустрэча была нападжана «ПА ПРОСЬБЕ ГЕРМАНСКАГА ПАСОЛЬСТВА». Усе газэты ўзмоцнена адзначаюць гэту частку паведамленьня. Прадстаўнік германскага пасольства ўказаў, што пытаньне аб сустрэчах Роззэнбэрга з брытанскімі палітычнымі дзеячамі канчаткова яшчэ ня высьветлена.

„ГЕРМАНІЯ ЗАЦІСНУТА ПАМІЖ РАСІЯЙ І ВАРОЖАЙ ФРАНЦЫЯЙ"

ЛЁНДАН, 9. У Інтэрв'ю з прадстаўніком «Дэйлі Экспрэс» Роззэнбэрг зрабіў наступную заяву з поваду гутаркі з Вансітартам:

«Пакуль яшчэ ня вынесена ніякіх рашэньняў. Абмяркоўваюцца важнейшыя пытаньні, якія датычаць ангельска-германскіх адносін. ГІТЛЕР УЗЯТ ПАД ВАРОЖУЮ КРЫТЫКУ З БОКУ БРЫТАНСКАГА ЎРАДУ. Я ПРЫБЫЎ СЮДЫ АЗНАЁМІЦЦА З ПАЛІТЫЧНЫМІ НАСТРОЯМІ І РАСЬСЕЯЦЬ НЕПАРАЗУМЕНЬНІ. ГЕРМАНІЯ ЗАЦІСНУТА ПАМІЖ КАМУНІСТЫЧНАЙ РАСІЯЙ І ВАРОЖАЙ ФРАНЦЫЯЙ. Наша краіна ахоплена барацьбой партыі, якую Гітлер стараецца ліквідаваць. Я спадзяюся, што мне ўдасца растлумачыць яго задачы вашаму ўраду, бо ад англа-германскай дружбы залежыць мір у Эўропе».

Далей Роззэнбэрг заявіў, што СПАДЗЯЕЦЦА НА ПОСЬПЕХ СВАЁЙ МІСІІ, але ў сучасны момант нічога пэўнага яшчэ сказаць ня можа. Ён намякнуў, што з германскага боку прыкладаюцца намаганьні да таго, каб дабіцца яго спатканьня з Макданальдам.

«Дэйлі мэйль» сьцьвярджае, што Роззэнбэрг наведаў Вансітарта для абмеркаваньня магчымасьці непадпісаць яму гутаркі з кіруючымі дзеячамі Англіі, з якімі ён хоча абмеркаваць існуючае палітычнае становішча ў Германіі. Зроблены таксама крокі, каб нападзіць сустрэчу паміж Роззэнбэргам і Дэвісам, які знаходзіцца зараз у Лёндане.

„Вялікая адвага" фашысцкага паслана

ЛЁНДАН, 9. (БЕЛТА). «ДЭЙЛІ ГЕРАЛЬД» паведамляе, што, НЯ ГЛЕДЗЯЧЫ НА МАЦНЕЙШАЕ ЖАДАНЬНЕ РОЗЗЭНБЭРГА ДАБІЦЦА ПРЫЁМУ Ў МАКДАНАЛЬДА, АФІЦЫЯЛЬНЫХ КРОКАЎ У ГЭТЫМ НАПРАМКУ НЯ БЫЛО ЗРОБЛЕНА З БАЯЗЬНІ АДМАЎЛЕНЬНЯ. Вось чаму Роззэнбэрг, паводле слоў газэты, зварачаецца да ліхаманкавых манэўраў, каб дабіцца сустрэчы з прэм'ерам. Аднак, яна мала праўдападобна. «У парляманцкіх колах, — піша газэта, — указваюць, што ня маецца на ўвазе, пад уплывам рыторыкі Роззэнбэрга, ставіць пытаньня аб зьмяненьні замежнай палітыкі».

«Н'юс Кронікль» зьмясьціла інтэрв'ю пэдзі Оксфорд з Роззэнбэргам:

«Я СКАВАЛА РОЗЗЭНБЭРГУ, ШТО З ЯГО БОКУ БЫЛО ВЯЛІКАЙ АДВАГАЙ ПРЫЕХАЦЬ У КРАІНУ, ДЗЕ, ЯК ЁН УБАЧЫЦЬ, НЯМА ДЗЬВЮХ ДУМАК НАКОНТ ЖОРСТКАСЬЦЯЙ І ШАЛЕНСТВАЎ, ЯКІЯ РОБЯЦЦА ЯГО ТЭЙ-ЖА ДУМКІ, ШТО І Я».

«Н'ЮС КРОНІКЛЬ», камэнтуючы інтэрв'ю, заяўляе: «Ніхто ня можа дазволіць сабе бясконца ігнараваць фактычна аднадушную думку нашай краіны, і гэта абставіна нямінуча зробіць свой уплыў».

„Германія для гітлераўцаў"

БЭРЛІН, 8. (БЕЛТА). Германскі міністар прапаганды і адзін з лідэраў нацыянал-сацыялістскай партыі **Гебэльс** выступіў учора з прамоваю, у якой закрануў пытаньне аб адносінах нацыянал-сацыялістаў да нацыяналістаў. Указаўшы, што ў «кожнай казлінай атрымлівае верх больш моцны», Гебэльс заявіў: «Мы паступова авалодаем усю дзяржаву. Праз некалькі месяцаў наступіць дзень, калі Германія будзе нацыянал-сацыялістскай».

***

БЭРЛІН, 8. (БЕЛТА).

Па-зачарговым пасяджэньнем кіраўніцтва аднэй з буйнейшых нацыянальных вайсковых арганізацый Германіі—саюзу «Кіф-Гейзэрбунд» пастаноўлена, што гэты саюз цалкам пад начальваецца Гітлеру. У далейшым кіраўніцтва саюзам будзе ажыцьцяўляцца аднаасабова яго старшынёю генэралам Горнам, які атрымае дыктатарскія паўнамоцтвы.

***

БЭРЛІН, 9. (БЕЛТА). Заўтра ўвечары будуць спалены на вогнішчы 20 тысяч кніг, зьмест якіх не адпавядае «германскаму духу». Гэту акцыю правядуць студэнты.

Выдатны германскі мастак **Макс Лібэрман** заявіў аб выхадзе са складу прускай акадэміі мастацтваў і адмовіўся ад годнасьці ганаровага прэзыдэнта акадэміі. 85-гадовы Лібэрман звыш 30 год зьяўляўся членам акадэміі і 12 год быў яе прэзыдэнтам.

***

БЭРЛІН, 9 (БЕЛТА). Старшыня партыі нацыяналістаў, міністар гаспадаркі **Гугенбэрг** перадаў усе паўнамоцтвы па кіраўніцтву партыяй старшыні нацыяналістскай фракцыі прускага ляндтагу **Вінтэрфэльду.**

Дырэктар Штутгардзкага аддзяленьня „Дэропу" пасаджан у канцлягер

МАСКВА, 9. (БЕЛТА). Уласны карэспандэнт «Известий» паведамляе з Бэрліну, што другі дырэктар аддзяленьня **«Дэропу»** ў Штутгарце савецкі грамадзянін **Допрапінэр,** пачынаючы з 30-га сакавіка, знаходзіцца ў **канцэнтрацыйным лягеры ў Хойбэргу.** Дзякуючы стараньням паўнамоцнага прадстаўніцтва СССР у Германіі ўдалося дабіцца праз міністэрства замежных спраў дазволу паведаць зьняволенага. Сёньня адзін з членаў пасольства выяжджае ў лягер.

Замежны друк аб італа-савецкай гандлёвай згодзе

РЫМ, 8. (БЕЛТА). **«Тэвэрэ»,** адзначаючы прадаўжэньне берлінскага савецка-германскага дагавору і падпісаньне новай італа-савецкай гандлёвай згоды, указвае на выключную палітычную важнасьць гэтых дакумантаў. Па думцы газэты, гэтыя дагаворы ўносяць заспакаеньне ў напружаную эўрапейскую абстаноўку і сьведчаць аб імкненьні іх удзельнікаў да мірнай палітыкі.

***

ЛЁНДАН, 9. (ТАСС). Лёнданскі друк падрабязна паведамляе аб падпісаньні італа-савецкай гандлёвай згоды. У ангельскіх дзелавых колах баяцца канчатковай страты ранейшага аб'ёму гандлёвых адносін з СССР. **«Дэйлі Геральд»** піша: «Мусаліні хутка ўмяшаўся, імкнучыся скарыстаць эмбарго, устаноўленае брытанскім урадам у адносінах да Расіі».

„Франка-савецкія адносіны усё больш паляпшаюцца"

ПАРЫЖ, 8. (БЕЛТА). Учора прыбыў савецкі ваенны аташэ тав. **Венцоў,** сустрэчаны на вакзале прадстаўнікамі паўпредзтва СССР і французкага ваеннага міністэрства.

Адзначаючы прыезд ў Парыж савецкага ваеннага аташэ тав. Вянцова, а таксама прыём у французкім пасольстве ў Маскве 5 мая, **«Эр нувэль»** піша: «такім чынам, усё больш удакладняецца аснованыя на давер'і супрацоўніцтве, якім характарызуюцца на працягу некалькіх месяцаў франка-савецкія адносіны. Збліжэньне абедзьвюх краін ужо дало для справы міру вынікі, значэньне якіх бясспрэчна. Гэтым вынікі зьяўляюцца верным заручкай спрыяючых результатаў, якіх можна чакаць. Нас павінны радаваць усе падзеі, якія нясуць з сабою новае выражэньне салідарнасьці, што ўстанаўляецца ў міжнароднай палітыцы абедзьвюх краін».

Значэньне франка-савецкіх адносін пачынаюць разумець нават рэакцыйныя колы. Правая газэта **«Орэр»** у артыкуле аб франка-савецкіх адносінах піша:

«Міжнароднае становішча такое, што Францыя не павінна пагаджаць пінкім падтрыманьнем, адкуль-бы яно не выходзіла».

***

Орган мэталюргічнай прамысловасьці «Юзін» заяўляе, што французкі ўрад павінен прылажыць усе намаганьні да таго, каб знайсьці глебу для заключэньня гандлёвага дагавору з Савецкім саюзам.

«Саветы, як мы гэта ўжо ня раз канстатавалі, — піша «Юзін», — адносяцца спрыяюча да павялічэньня французкіх паставак. Яны хочуць толькі карыстацца ў нас такім-ж доўгім тэрмінам плацяжу, якія ім даюць нашы канкурэнты.

Жэнэўскія зарысоўкі



Польшча патрабуе павялічэньня ўлады камісара Лігі нацый у Данцыгу

ВАРШАВА, 8. (БЕЛТА). «Газэта польска» канстатуе, што «Данцыг паступова ператвараецца ў ваенную базу нацыянал-сацыялістскай партыі, за якой хаваецца афіцыяльная Германія». У такой абстаноўцы, па думцы афіцыёзу, неабходна даць камісару Лігі нацый выканаўчую ўладу, без якой немагчыма захаваньне канстытуцыі вольнага горада.

«Улада камісара Лігі нацый існавала да тэтага часу толькі на паперы,— піша далей газэта. Зараз прышоў момант, калі яна павінна стаць рэальнай. Гэтай мэты можна дасягнуць толькі шляхам устанаўленьня міжнароднай паліцыі ў Данцыгу... Падзеі ў Данцыгу разгортваюцца з галавакружнай шпаркасьцю. Кожны дзень прыносіць новыя факты, якія сьведчаць, што Данцыг, які павінен быў даць Польшчы доступ да мора, ператварыўся ў бастыён германскага шавінізму ў яго барацьбе з Польшчай. Польская грамадзкая думка мае права патрабаваць зараз ад Лігі нацый энэргічных мер».

Раззброіваюцца...

Адказ Францыі і Германіі на прапановы канфэрэнцыі па разбраеньні

ПАРЫЖ, 8. (БЕЛТА). У сэнаце пачалося абмеркаваньне морскага бюджэту, які вылічваецца ў 2.716 млн. франкаў. Дакладчык падкрэсьліў, што Францыя павінна захаваць існуючую зараз роўнавагу ваенна-морскіх сіл, выходзячы са сваіх інтарэсаў, як калініяльная дзяржава. Морскі міністар **Лейг** падкрэсьліў, што Францыя не адступіць у Жэнэве ад занятай пазыцыі ў морскім пытаньні, бо Францыя павінна захаваць займаемае ёю месца сярод сусьветных дзяржаў.

ЗВАРОТ ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ КАМІНТЭРНУ ДА НЕЗАЛЕЖНАЙ РАБОЧАЙ ПАРТЫІ

ЛЁНДАН, 4. (БЕЛТА). «Дэйлі Уоркер» у нумары ад 3 мая друкуе наступны зварот Выканкому Камінтэрну да Незалежнай Рабочай партыі Англіі:

«Сакратарыят Камуністычнага Інтэрнацыяналу вітае раённые канфэрэнцыі Незалежнай Рабочай партыі Англіі аб выхадзе з другога інтэрнацыяналу і аб пачатку перагавораў з сакратарыятам Камінтэрну, «з мэтаю высьветліць, якім шляхам Незалежная Рабочая партыя зможа садзейнічаць рабоце Інтэрнацыяналу».

На працягу апошніх тыдняў Незалежная Рабочая партыя Англіі прымала ўдзел у выступленьнях сумесна з кампартыяй супроць фашысцкага тэрору ў Германіі і супроць пагрозы новай імпэрыялістычнай вайны. Цяпер канфэрэнцыя Незалежнай Рабочай партыі парашыла, баручы прыклад з лёнданскай і ланкаширскай акруговых арганізацый, пашырыць згоду аб стварэньні адзінага фронту з камуністамі на неабходных пытаньнях барацьбы ангельскіх працоўных, чыгуначнікаў, тэкстыльшчыкаў і г. д. У гэтай агульнай барацьбе сумесна з камуністамі тысячы членаў Незалежнай Рабочай партыі ў абставінах банкрутства палітыкі клясавага супрацоўніцтва другога інтэрнацыяналу і яго секцыі, у тым ліку і рабочай партыі Англіі, і параходу германскай сацыял-дэмакратыі ў лягер фашызму, мелі магчымасьць пераканацца на ўласным вопыце, паколькі насьпела патрэба аб'яднаньня ўсіх рэвалюцыйных пралетарскіх сіл, якія стаяць на пазыцыі непрымірымай клясавай барацьбы.

Толькі аб'яднаньне ўсіх рэвалюцыйных пралетарскіх сіл Англіі на аснове непрымірымай клясавай барацьбы, на якой грунтуецца праграма і тактыка Камуністычнага Інтэрнацыяналу, зьвяцца паваротным пунктам у ангельскім рабочым руху і адкрые міжнародную перспэктыву для рэвалюцыйных рабочых, аб'яднаных Незалежнай Рабочай партыяй.

Сакратарыят Камінтэрну цьвёрда ўпэўнен, што раённые, прынятае большасьцю канфэрэнцыі Незалежнай Рабочай партыі Англіі аб перагаворах з ім, сустрэне гарачае спачуваньне большасьці членаў Незалежнай Рабочай партыі і ўсіх перадавых рабочых Англіі.

Сакратарыят Камінтэрну з свайго боку заяўляе аб свабёй гатоўнасьці пачаць перагаворы з кіраўніцтвам Незалежнай Рабочай партыі.

Сакратарыят Камуністычнага Інтэрнацыяналу».

Пратэсты ангельскіх рабочых супроць эмбарго працягваюцца

ЛЁНДАН, 9. (БЕЛТА). Пратэсты рабочых арганізацый супроць эмбарго на ўвоз з СССР працягваюцца з неаслабнай сілай. За апошнія дні рэзалюцыі пратэсту былі вынесены чыгуначнікамі **Форэстгейту,** транспартнікамі **Віл-эф-Лівэну,** машынабудаўнічымі рабочымі **Сэльфорду, Манчэстэру і інш.**

Муніцыпальны савет **Элінгтону** (вугальны раён Ёрмшыру) у лісьце да Макданальда асуджае ўвядзеньне эмбарго.

***

ЛЁНДАН, 8. (БЕЛТА). Сэр **Стафорд Крыпс,** намесьнік лідэра парляманцкай лейбарыстскай фракцыі, выступаючы ў **Брыстолі,** сказаў, што ён азнаёміўся з часткай стэнаграфічнай справаздачы аб працэсе шкодніцкіх дзеяньняў на электрастанцыях і што, па яго думцы, а таксама па думцы юрыстаў, з якімі ён гутарыў, нельга сказаць, што ангельскія інжынэры не вінаваты, і таму дзеяньні ангельскага ўраду ня мелі ніякага апраўданьня.

***

ЛЁНДАН, 9 (БЕЛТА). Муніцыпальны савет **Карлыфу** пастанавіў хадайнічаць перад урадам аб адмене эмбарго на ўвоз з СССР. Пастанову падтрымалі ня толькі лібералы і лейбарысты, але і кансэрватары. Некалькі саветнікаў указвалі, што калі эмбарго працягнецца яшчэ два месяцы, Кардыфскі порт замрэ. Апэрацыі з СССР забясьпечваюць работай 5.000 кардыфскіх рабочых. Многія ўжо пазбавіліся зарабітку. Кардыф — цэнтр вугальнага экспарту ў Англіі.

Як паведамляе **«Манчэстэр Гардыян»,** калі раду буйнейшых фірм манчэстэрскай акругі не паступяць новыя заказы, нямінучы звальненьні рабочых.

КЕРАНСКАМУ НЕ ШАНЦУЕ

ЛЁНДАН, 8. (Белта). Як паведамляюць з МАДРЫДУ, КЕРАНСКАМУ, выступіўшаму ў літаратурным клюбе з антысавецкімі лекцыямі, была нападжа на абструкцыя. Зьяўленьне Керанскага на трыбуне было спаткана аглушальным сьвістам. Антысавецкія выпады Керанскага выклікалі вялікае абурэньне. Ледзь не дайшло да бойкі. Керанскаму прышлося выйсьці пад сьпевы «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛУ» і воклікі рэвалюцыйных рабочых у гонар СССР. На вуліцы абураныя рабочыя пагражалі Керанскаму жорсткай расправай.

Японскія войскі бязупынна наступаюць

ШАНХАЙ, 9. (Белта). Учора японскія войскі працягвалі наступленьне ў раёне на ўсход ад ракі Луань і занялі **Люшуін і Фунін.** Сёньня кітайскія войскі адыходзяць на лінію **Луань,** прыкрываючы адыход ар'ергардамі сутычкамі. У раёне **Сіфынкоў і Нанцяньмін** японцы атакуюць пакуль што слаба, не прасоўваючыся ў сувязі з апэрацыямі ў раёне Луань. Паінфармаваныя японскія колы указваюць, што мэтаю апэрацыі, з аднаго боку, зьяўляецца выцясьненьне кітайскіх войск з паласы, якая ахапляе прыкладна раёны **Міюнь, Цзічжоў, Цузуньхуа, Цяньань** і раку **Луань,** для стварэньня дэмілітарызаванай паласы ўздоўж граніц Манчжоу-Го і, з другога боку, «правучыць» кітайцаў, каб папярэдзіць новыя спробы заняцьця гэтай паласы.

На фронце ў раёне **Гуюань** (на паўдарозе паміж Доланорам і Калганам) без перамен. Паводле кітайскіх паведамленьняў, Гуюань пакуль у кітайскіх руках.

Зарубежныя рабочыя дэлегацыі ў Маскве

МАСКВА, 9. (БЕЛТА). 10 дзён прабылі **аўстрыйскія, гішпанскія, галяндзкія, нарвэскія, французкія, ангельскія і эстонскія** рабочыя дэлегаты ў гасьцях у маскоўскага пралетарыяту.

За гэтыя дні зарубежныя дэлегацыі агледзелі буйнейшыя маскоўскія фабрыкі і заводы, паведалі тэатры і рабочыя клюбы, агледзелі памяшканьні рабочых, школ і дзіцячых дамоў; былі на вечары т-ва старых бальшавікоў, у ЦДЧА ў гасьцях у Чырвонай арміі, а ўчора іх прыняў сакратар УсЦВПС тав. **Швэрнік.**

Ангельская дэлегацыя так гаворыць аб першамайскім парадзе і рабочай дэманстрацыі ў Маскве: «Гэта было найвялікшае відовішча. Нічога падобнага ў жыцьці мы ня бачылі. Магутнасьць і энтузіязм маскоўскіх пралетарыяў, якія бясконцым патокам праходзілі па Красным пляцы, паказваюць іх бязьмежную адданасьць партыі і ўраду, іх рашучасьць абараняць сацыялізм».

Учора замежныя рабочыя дэлегацыі выехалі ў **Харкаў, на Днепрадзэс, у Баку, Данбас, Мінэральныя воды** знаёміцца з Савецкім саюзам. У СССР яны прабудуць 10-15 дзён.

Замежныя рабочыя дэлегацыі ў Наркампрацы СССР

МАСКВА, 8. (БЕЛТА). 5 мая ў Наркампрацы СССР адбыўся прыём замежных рабочых дэлегацый, прыбыўшых у СССР на першамайскія сьвяты.

У 3-х гадзінный гутарцы народны камісар працы СССР тав. А. М. ЦІХАН падрабязна азнаёміў дэлегатаў з працоўным законадаўствам Савецкага саюзу. Доўгімі апладысмэнтамі замежныя рабочыя дэлегацыі сустрэлі прадстаўнікоў старых бальшавікоў, якія віталі дэлегацыі і запрасілі да сябе ў госьці зарубежных пралетарыяў, каб з імі падзяліцца вопытам сваёй рэвалюцыйнай бар

ЖКП/б

Менск

Партыкалектывы фабрык і будаўніцтваў гораду Менску пачалі прапрацоўку пастановы ЦК і ЦКК УсеКП(б) аб чыстцы партыі.

НА ФАБРЫЦЫ «КАСТРЫЧНІК» пастанова партыі аб чыстцы прапрацавана на адкрытым партыйным сходзе. 7 мая адбыліся адкрытыя партыйныя сходы двух зьмен.

На 20 мая склікаецца агульна-заводская канфэрэнцыя, зьвязаная з чысткай партыі і барацьбой камуністаў і ўсіх рабочых за якасьць прадукцыі. На канфэрэнцыю запрашаюцца прадстаўнікі ад базавых арганізацый, тэкстыльшчыкаў, саюзшвэйсбыту, Наркамлёгпраму, швейаб'яднаньня, ад ЦК і ЦП саюзу швейнікаў, ЦСПСБ.

Па Мінбуду у сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) аб чыстцы партыі праводзіцца праверка рэалізацыі самазабязацельстваў, прынятых у часе распрацоўкі пастановы студзеньскага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б). Арганізавана 11 брыгад для праверкі расстаноўкі партыйных і камсамольскіх сіл, высьвятленьня недахопаў на вытворчасьці і дапамогі ў зьнішчэньні іх.

Праверка ролі камуністаў на вытворчасьці ўжо дала некаторыя вынікі. Выяўлена, што загадчык аддзелу кадраў камуніст РАЕЦКІ не забясьпечыў [illegible] побудовы рабочай сілай, у той час, калі на іншых будаўніцтвах ёсьць лішкі рабочых. Прараб камуніст тав. КАПЕНІК патураў прагульшчыкам. Справа аб гэтых камуністах перададзена на вырашэньне бюро партколектыву.

НА АБУТКОВАЙ ФАБРЫЦЫ ІМЯ КАГАНОВІЧА праведзены цэхавыя сходы па пытаньні аб чыстцы партыі і выкананьні пляну першага кварталу. Памёж цэхамі разгорнута сацыспаборніцтва на паляпшэньне якасьці выпускаемай прадукцыі (БЕЛТА).

Воршa

Партыйныя ячэйкі Аршанскага раёну практыкуюць вельмі цікавы вопыт партыйна-масавай работы ў калгасах. У брыгадах перад сяўбой былі арганізаваны БРЫГАДНЫЯ ТРЫКУТНІКІ ў складзе брыгадзіра, партарганізатара і камсамольскага арганізатара. Такія трыкутнікі выпучаны ў брыгадах калгасаў «Рабочая культура», «Чырвоны партызан», «Ленінскія ўсходы», «Чырвоны Сцяг» і інш. Напярэдадні масавай сяўбы быў праведзен раённы зьлёт брыгадных трыкутнікаў, на якім быў падагулён першы вопыт гэтай новай формы партмасавай работы.

У тых брыгадах, дзе камуністаў няма, практыкуецца вылучэньне БРЫГАДНЫХ АГІТАТАРАЎ з лепшых беспартыйных актывістаў-калгасьнікаў. Як падрыхтоўка, так і самая сяўба даказваюць, што такі вопыт партмасавай работы дзейсны і варты пашырэньня.

Асаблівы цікавы вопыт масавай работы праводзіць БАГУШЭЎСКАЯ сельсавецкая партыйная ячэйка. Замест неапрацаванага сяўбы ўпаўнаважаных, ячэйка прымацавала камуністаў непасрэдна да брыгад, усклаўшы на іх абавязкі ПАРТОРГАЎ.

Ячэйка арганізавала агіт-фургон, у які ўвяходзілі кіно-брыгада, радыё, агітаторы. Агітфургон распаўсюджвае літаратуру, выпускае штодзенкі, вусныя газэты і г. д.

Апіраючыся на цэлкам апраўдаўшы сябе вопыт гэтай ячэйкі, Аршанскі РК КП(б)Б пастанавіў усіх упаўнаважаных па праведзеньні веснавой сяўбы ў сельсаветах НАКІРАВАЦЬ У КАЛГАСЫ Ў ЯКАСЬЦІ ПАРТАРГАНІЗАТАРАЎ, вызваліўшы іх ад абавязкаў [illegible].

ЦК ЛКСМБ

Для ўмацаваньня работы вясковых камсамольскіх арганізацый і забясьпячэньня сапраўднага правядзеньня веснавой сяўбы, ЦК ЛКСМБ паслаў у [illegible] 600 камсамольцаў сакратарамі вясковых камсамольскіх ячэек (Белта).

Тав. МІЛІЦКІ—рабочы-ударнік заў. «Камунар» (Менск)

СМЕРЦЬ тав. ОЛЬМІНСКАГА

МК і МГК УсеКП(б) з глыбокім жалем паведамляюць членаў Маскоўскай арганізацыі УсеКП(б) аб сьмерці старэйшага падпольшчыка, прафэсыянальнага рэвалюцыянэра нашай партыі, аднаго з актыўнейшых членаў Маскоўскай арганізацыі, удзельніка кастрычніцкага перавароту ў Маскве і стойкага барацьбіта за генэральную лінію партыі—

тав. Ольмінскага (Александрава) Міхаіла Сьцяпанавіча

МК, МГК УсеКП(б).



Бальшавікі, рабочыя заводу імя Карла Маркса з глыбокім жалем спаткалі вестку аб сьмерці бязьмежна адданага справе камунізму, сапраўднага бальшавіка, прайшоўшага суровую школу царскага падполья, тав. Ольмінскага. Тав. Ольмінскі быў цесна зьвязан з піцерскімі рэвалюцыйнымі рабочымі. Мы яго ведалі па падпольнай работцы рэвалюцыйнага руху на заводзе «Новы лесьнэр». Сьмерць вырвала з нашых радоў слаўнага ленінца, але справа камунізму, пад кіраўніцтвам най лепшага вучня і паслядоўніка Леніна — тав. Сталіна, жыве і пераможа назаўсёды.

(З рэзалюцыі партсходу ленінградскага заводу імя Карла Маркса).

ПАМЯЦІ СТАРЭЙШАГА ПАРТЫЙЦА

Памёр адзін са слаўных ветэранаў старой партыйнай гвардыі тав. ОЛЬМІНСКІ, адважны рэвалюцыянэр, бальшавік-літаратар. Яго вострае пяро мяткa паражала ворагаў пралетарскай партыі. Тав. ОЛЬМІНСКІ пачаў працаваць у бальшавіцкім друку з 1904 г. Ён быў членам рэдакцыі газэты «ВПЕРЕД». Потым працаваў у газэце «ПРАЛЕТАРЫ». У эпоху ўздыму рабочага руху з 1911-12 г. г., эпоху «ЗВЕЗДЫ» і «ПРАВДЫ» тав. Ольмінскі—на пасту члена рэдакцыі «ПРАВДЫ». Яго балёвыя артыкулы ня раз заслугоўвалі пахвалы тав. Леніна. Спачатку рэвалюцыі 1917 году тав. Ольмінскі працуе ў якасьці адкага з рэдактароў Маскоўскай бальшавіцкай газэты «Сацыял-дэмакрат», прымае актыўны ўдзел у Кастрычніцкай рэвалюцыі. Пачаўшы сваю работу з першых кронаў бальшавіцкага друку, тав. Ольмінскі паказаў высокія ўзоры вернасьці партыі, непахісной стойкасьці і прынцыповасьці. Яго жыцьцё і барацьба — прыклад для ўсіх работнікаў бальшавіцкага друку, кожнага камуніста.

РЭДАКЦЫЯ «ПРАВДЫ».

Да чаго прывяла адсутнасьць клясавай пільнасьці

Калгас «На варце» — самы буйны рэвалюцыянэры занялі ў калгасе камандныя пасты. Старшыня рэўкамісіі Вэртліб — спэкулянт, адкрыта пакрываў раскрадвальнікаў калгаснай маемасьці, сам спэкуляваў ёю, прысвойваў грошы ад калгаснай воўначоскі, сыстэматычна наладжваў папойкі і сходкі на сваёй кватэры, дзе абгаворвалі мэтады разбурэньня калгасу. Лісьнеўскі — рахункавод, ідэйны кіраўнік контр - рэвалюцыйнай групы, прыкрываўся званьнем сельскора, заблытаў канчаткова ўвесь улік, вырываў лісткі з грашовых і вучотных кніг, прыпісваў сваім сваякам працадні. Ён быў актыўным кіраўніком тайных сходаў на кватэры Вертліба. Ліхманаў М. — кіраўнік групы садзейнасьці РСІ, лодыр, які за лістапад і сьнежань месяцы выпрацаваў 5,5 працадзён, выступаў сьведкай на судзе ў абарону раскрадвальнікаў калгаснай маемасьці.

Контр-рэвалюцыянэры мелі цесную сувязь з баптысцкай групай, якая сканцэнтравала сваю работу на трэцяй фэрме калгасу і на млыне ў вёсцы Цыкава, куды больш за ўсё зьбіраліся калгасьнікі.

Што-ж рабілі камуністы, пастаўленыя на чале гэтага буйнога калгасу? Замест сапраўднай барацьбы, замест рашучай ачысткі калгасу ад кулацкіх і варожых элемэнтаў, яны трымалі цесную сувязь з контр-рэвалюцыянэрамі, давяралі ім і фактычна дапамагалі раскрадваць, разбазарваць і разбураць калгасы, сыстэматычна п'янствавалі. Старшыня калгасу Цыганкоў ня лічыўся з калгасным актывам, адміністраваў і разбазарваў калгасную маемасьць. І контр-рэвалюцыйная група, хаваючыся за сьпіной камуніста Цыганкова, паціхеньку праводзіла сваю шкодніцкую работу.

Партыйная ячэйка на чале з Міхневічам і Цыганковым ня бачыла кулакоў-шкоднікаў, якія сядзелі ў калгасе. Вось чаму здарылася, што гэта група значна лепш, чым партыйная ячэйка расставіла свае контр-рэвалюцыйныя сілы на рашаючых вучастках вытворчасьці.

Партыйная ячэйка ніякай палітвыхаваўчай работы не праводзіла. Партсходы зрываліся, кандыдаты партыі зрошчваліся з кулацкімі элемэнтамі (Новікаў, Марозаў), яны нават не газэтавалі за выключэньне кулакоў з калгасу. Важнейшыя пастановы партыі і ўраду (аб кані, аб ахове сацмаемасьці, прамова тав. Сталіна і інш.) не прапрацоўваліся, камсамольская ячэйка бязьдзейнічала, ніякай работы сярод моладзі не праводзілася.

РайКК-РСІ, якая ў сьнежні 1932 году правярала работу калгасу, падышла паверхоўна да выяўленьня шкодніцтва, абмежавалася фактамі, аб якіх пісала райгазэта. Абмяркоўваючы матар'ялы гэтага паверхоўнага абследваньня на вызнным пасяджэньні, райКК вынесла пастанову аб зьняцьці з работы старшыні калгасу Цыганкова. Але райКК не давяла нават гэтай справы да канца: Цыганкоў застаўся старшынёй калгасу, атрымаўшы тут-жа ў РКК такую характарыстыку: «Ён мае добрыя арганізатарскія гаспадарчыя здольнасьці і бальшавіцкую настойлівасьць для выкананьня задач, якія ставіць перад калгаснікамі партыя...» У гэты-ж час райКК нават не змагла сваячасова ўскрыць, што ў складзе актыву РСІ быў шкоднік Ліхманаў. Гэта сьведчыць аб невыстарчальнай клясавай пільнасьці ў работнікаў крычаўскай РКК-РСІ і аб гніла-ліберальных адносінах да буржуазных перараджэнцаў.

Па гэтай справе прэзыдыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК-РСІ Беларусі вынесьлі адпаведную пастанову. Справа калгасу «На варце» зьяўляецца сур'ёзным палітычным урокам ня толькі для партарганізацыі Крычаўшчыны, але і для ўсіх партыйных арганізацый рэспублікі.

М. Екельчык.

Правільна арганізаваць працу на Асінторфе

Даць заводу нехапаючыя трактары і фармовачныя машыны

(АД НАШАГА СПЭЦЫЯЛЬНАГА КАРЭСПАНДЭНТА)

Завод Асінторф праграму мінулага году выканаў толькі на 50 проц. Нават з гэтай колькасьці здабытага машына-фармовачнага торфу каля 2 тысяч тон і да сёнешняга дня засталіся ляжаць на балоце. У выніку завод пусьціў у паветра каля 15 тыс. рублёў.

Ляжыць таксама на балоце каля 5 тыс. тон фрэзэрнага торфу, які Белдрэс ня можа скарыстаць на апал з-за вялікай яго вільготнасьці. Гэтага торфу нельга ўжо будзе прасушыць, а прыдзецца раскідваць і фрэзэраваць нанава. Незваротных затрат па машына-фармовачным і фрэзэрным торфе за сэзон 1932 году завод меў каля 115 тыс. рублёў. Гэта выклікала некаторыя фінансавыя труднасьці.

Праграма дзеяньня на сэзон 1933 году—даць Белэнэргакамбінату (Белдрэс) 173 тоны добранаснага тарфянога апалу.

З прычыны ня зусім добрай падрыхтаванасьці Асінторф і ў гэтым годзе ня можа в посьпехам распачаць торфаздабычы. Каб забясьпечыць бесьперабойную работу на балоце, патрэбна яшчэ правесьці раскарчоўку на плошчы ў 11 га. зьняць ачос з 15 га. Работа па плінтоўцы балота выканана толькі на 25 проц. На кар'ерах 11, 10, 1.2 з 266 га заплітавана ўсяго 66 га. Падкарчоўка праведзена на плошчы 75 га замест патрэбных 225, што складае толькі 35 проц. пляну.

Значная частка балота, дзе будзе здабывацца фрэзэрны торф, заліта вадой, што перашкаджае сваячасоваму пачатку здабычы торфу.

На сушку фрэзэрнага поля Саюзторфам і Белторфам асигнаваны сродкі, але яны яшчэ не скарыстаны.

Для паглыбленьня ракі Выдрыцы і вадаадводных канаў трэба было выкінуць да пачатку сэзону 1933 году каля 20 тысяч куб. мэтраў зямлі, але і да сёнешняга дня ня выкінута ні аднаго куб. мэтра. Гэта важнейшае мерапрыемства ня ўлічана, што можа, як і ў мінулым годзе, зьнізіць колькасьць і якасьць торфу.

Як-жа падрыхтаваны да торфаздабычы торфмашыны і мэханізмы? «Элеватарныя або фармовачныя машыны ў колькасьці 15 штук у нас поўнасьцю адраманТаваны і пастаўлены ў рабочае становішча, казялкі расстаўлены, засталася яшчэ некаторая дробязь», — так заявіў тэхнічны дырэктар заводу т. Мелавідаў. Сапраўдную гатоўнасьць машын і мэханізмаў паказаў іх пробны пуск, які праводзіўся з 20-га па 25 красавіка. Машына № 13 паказала некаторыя дэфэкты. Элеватарнае палатно не падпарадкавалася руху самой машыны з прычыны дрэннага рамонту. Не адрэгуляваны да машыны казялкі. Такія-ж дэфэкты выявіліся амаль ва ўсіх астатніх машынах кар'ераў (№ 15 і інш.).

Для поўнага асваеньня праграмы машына-фармовачнага торфу на сэзон 1933 году ў колькасьці 104 тон Асінторфу патрэбны яшчэ тры элеватарныя машыны. Іх на заводзе няма, а яны маглі ўжо быць завезены на Асінторф і ўстаноўлены на месцы іх работы. Хто вінават у гэтым? Вінават Белторф. Па заказу Саюзторфу ў студзені г. г. заводам імя Варашылава зроблена было пяць машын. Яшчэ прыкладна за месяц да выпуску іх дырэкцыя заводу імя Варашылава ня раз паведамляла Белторфу, каб апошні перавёў крэдыты на выкуп 3-х машын, патрэбных для Асінторфу. Саюзторф таксама прапанаваў Белторфу фарсаваць выкуп машын. Аднак, гэта Белторфу аказалася «не пад сілу». Пакуль кіраўнікі Белторфу думалі і разважалі, прайшоў месяц. Саюзторф вымушан быў накіраваць гэтыя пяць машын на Шатурскі торф завод (РСФСР).

Ня так даўно Белторфам заключан дагавор з заводам імя Варашылава на выраб нехапаючых па сыстэме дзесяці машын, у тым ліку 3-х для Асінторфу, 2-х для заводу «Чырвоны сьцяг» і інш. Паводле заявы загадчыка стала заказаў заводу т. Гразоўскага, машыны будуць зроблены не раней 15-20 мая. Марудносьць выпуску машын тлумачыцца тым, што Стальзбыт не забясьпечыў сваячасова заводу патрэбнай колькасьцю сталі і жалеза. Зараз мэталь атрыман і ёсьць поўная магчымасьць паскорыць выпуск машын. Задача варашылаўцаў павінна заключацца ў тым, каб узмацніць тэмпы выпуску машын для торфзаводаў і гэтым самым даць магчымасьць бесьперабойна распачаць торфаздабычу.

На здабычы фрэзэрнага торфу павінна працаваць у гэтым годзе 26 трактараў. Ёсьць у наяўнасьці толькі 20. Гатовы выйсьці на працу 15. Астатнія 5 зусім надаўна атрыманы ад іншых заводаў Белторфу і зданы ў рамонт уласнай майстэрні заводу.

Да завозу 6-ці трактараў, якія вельмі неабходны для поўнага асваеньня праграмы па здабычы фрэзэрнага торфу, ніхто па сутнасьці ня прыняў належных захадаў. Дырэкцыя Асінторфу амаль штодзённа пасылае Белторфу дакладныя, дзе зазначае па недахват трактараў. Белторф у сваю чаргу, пасылае разнарадкі па атрыманьне трактараў з іншых заводаў. Словам, людзі пішуць, а трактараў на заводзе няма і да сёнешняга дня. Мэханічная група Белторфу на чале з загадчыкам тав. Шунэйкам паслала торфзаводам ужо больш 5-ці распараджэньняў аб перакідцы лішніх трактараў на завод Асінторф, але не дамагалася іх выкананьня. Гэта іменна і прывяло да таго, што заводы: «Шлях сацыялізму», «Першага мая», «Бальшавік» і Дукоры яшчэ і да гэтага часу не далі для Асінторфу ні аднаго трактара. Дырэкцыя-ж Асінторфу на чале з т. Карандзеем спадзяецца, што занараджаныя для заводаў трактары прыбудуць самі, і ніякіх канкрэтных захадаў па атрыманьні іх ня ўжывае.

Не гатова дагэтуль і значная частка дэталяй для машын. Плян вырабу падкладных дошак да элеватарных машын выканан на 50 проц. З патрэбных 4 тысяч, зроблена толькі 2 тыс. штук. Ня зроблена яшчэ 19 шт. валказьбіральнікаў.

Усе гэтыя дэталі вырабляе мэханічны цэх торфзаводу. Аднак, работу яго нельга прызнаць здавальняючай. Цэх працуе бяз пляну. Нормы выпрацоўкі для кожнага работніка адсутнічаюць, расцэнкі на выраб розных дэталяй і запасных частак устанаўляюцца на вока, у зарплаце рабочых пануе ўраўнілаўка. «Мой аклад у месяц 110 р. Заробіш 50 — атрымаеш 110, заробіш 200 руб. — усё роўна атрымаеш 110 руб.», — так расказвае рабочы гэтага цэху т. Шупіла.

Працы рабочых ніхто не кантралюе, рабочы зробіць дзьве дэталі — добра, зробіць 10 — таксама добра.

Асінторф — буйнейшы завод у БССР. Правільная арганізацыя працы на заводзе, расстаноўка сіл адыгрываюць важнейшую ролю ў выкананьні пляну торфаздабычы. Аб гэтым павінны цьвёрда памятаць арганізацыі Асінторфу. Задача Белторфу — дапамагчы дырэкцыі заводу ў бліжэйшыя дні дастаць нехапаючыя 6 трактараў і 3 элеватарныя машыны з тым, каб даць магчымасьць заводу поўнасьцю асвоіць вытворчую праграму 1933 году.

М. Нікіцін.

ПА ШПАЛЬТАХ СССР

Шэфства НК замежных спраў над шахтай «Ільліч»

Калектыў работнікаў НК замежных спраў СССР ужо чатыры гады шэфствуе над шахтай «Ільліч» (Кадыеўскі раён—Данбас). Партыйныя ф прафсаюзныя арганізацыі НКЗС сыстэматычна дасылаюць на шахту сваіх работнікаў для дапамогі ў рабоце.

Дэлегацыя калектыву НК замежных спраў прымала ўдзел у першамайскіх сьвятах на шахце і прывязла ліст ад народнага камісара тав. Літвінава і кіраўнікоў партыйнай і прафсаюзнай арганізацыі Наркомату.

«Мы з гонарам даведаліся аб тым, што наша шахта выканала квартальны плян—гаворыцца ў лісьце—і з вялікім задавальненьнем адзначаем, што шахта «Ільліч» перавыканала і заданьне за красавік».

Калегія НКЗС узнагародзіла граматамі і падарункамі 16 лепшых ударнікаў шахты «Ільліч» («СОЦИАЛИСТИЧЕСКИЙ ДОНБАСС»).

Зьезд старух-калгасьніц Кабардзіна-Балкарыі

На працягу некалькіх дзён у Нальчыку (галоўны горад Кабардзіна — Балкарскай вобласьці) адбываўся зьезд старух-калгасьніц. У зьезьдзе прымала ўдзел 600 чал.

Вялікае значэньне гэтага зьезду ў тым, што ён ўзьняў новыя незакранутыя пласты калгаснага актыву, мабілізаваў іх на ўзмоцненьне калгаснага ладу.

Зьезд прайшоў з вялізарным уздымам. Выступалі дзесяткі старух-калгасьніц, якія дзяліліся сваім вопытам і крытыкавалі работу вадсталых раёнаў і калгасаў.

Дэлегатцы Малай Кабарды доўга не давалі гаварыць: «Ты не заслужыла такога гонару: у вас дрэнна ідзе сяўба».

Пасьля дакладу сакратара абласнога тав. КАЛМЫКОВА, многія старухі ноччу прыходзілі да яго на кватэру, каб пагутарыць з ім. «Ты адкрыў нам вочы,—заявілі яны,—цяпер мы зможам выкарчаваць усе кулацкія карэнчыкі» («МОЛОТ»).

Першыя каўшы сталінскіх ліцейшчыкаў

Дзякуючы шырокаму разгортваньню сацспаборніцтва і тэхнічнай вучобы, ударнікі-ліцейшчыкі Сталінскага мэталюргічнага заводу, (Сібір) без замежнай дапамогі асвоілі адліўку шпакавых доменных каўшоў вагою ў 18 тон. Каўшы раней выраблялісь на Краматорскім заводзе ў Данбасе. Выпрабаваньне першых сібірскіх каўшоў дало добрыя вынікі. Да 1 мая ліцейны цэх даў доменшчыкам 22 каўшы. («ТРУД»)

Новыя савецкія матацыклы

Уступілі ў строй зборачны цэх Іжаўскага матацыклетнага заводу і першая чарга мэханічнага цэху. Завод выпусьціў два першыя вопытныя матацыклі канструкцыі «Нати—А 750». Машыны зроблены з савецкіх матар'ялаў. З будучага году завод будзе штогодна выпушчаць 3.000 матацыклаў. («Известия»).

Электрафон „Масква"

На днях адбыліся іспыты першага савецкага электрафону «Масква», які, паводле водзываў кампазытара Гліера і інш. прадстаўнікоў музыкальнага сьвету, дае выключны па паўнаце і чыстаце гук.

Мадэль новага электрафону ў два разы таней звычайных патэфонаў. Электрафон дае гук праз звычайны іглатрымальнік, злучаны з кардоннай мэмбранай тыпу «Рэкорд», што ўжываецца ў радыёўстаноўках, і прыводзіцца ў рух мініятурным маторам. Праблема масавага выпуску гэтых маторaў ужо вырашана інжынэрамі Данілеўскім і Любарскім. («КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА»).

Новая сыравіна для мыла варанай прамысловасьці

Сярэдняя - Волскі навукова-дасьледчы харчовы інстытут вынайшоў новы від сыравіны для лёгкай прамысловасьці. Гэта—майскі хрушч, у целе якога шмат тлушчу, прыгоднага для варкі мыла. У панцыры жука знойдзен хоцін, які ўжываецца ў вытворчасьці кінаплёнкі. Да 40 тысяч га хвойных лясоў Сярэдняй Волгі заражана майскім хрушчом; яго зьбіраюць дзесяткамі тон і спальваюць («ЗА ПИЩЕВУЮ ИНДУСТРИЮ»).

БОЛЬШ УВАГІ ТЭАТРАЛЬНАМУ ФРОНТУ БССР

Х. Дунец

Пасьля некаторага скарачэньня сеткі тэатраў за кошт перасоўных і наогул за кошт незабясьпечаных кваліфікаваным кіраўніцтвам тэатральных адзінак, дзяржаўная тэасетка на сёнешні дзень складаецца з дзевяці буйных тэатраў, сярод якіх ёсьць такія відучыя адзінкі, як БДТ-1 і II, ЯДТ, тэатр оперы і балету.

Аб вялікай ролі тэатру ва ўсёй нашай сыстэме палітычнай асьветы мас, як і безумоўна вялікім росьце нашых відучых тэатраў БССР, ня прыходзіцца шмат гаварыць. Чым больш патрабаваньні [illegible] мы прад'яўляем тэатрам, тым больш увагі мы павінны ім аддаваць.

Між тым, усе асноўныя тэатры БССР уступілі ў 1933 год з вялікімі прабеламі як у галіне ідэалёгічна-мастацкай, так і ў фінансавай. Праграма паказаў амаль ні адным з відучых тэатраў ня выканана. Шукаюць усялякіх аб'ектыўных прычын. Аднак, ня гледзячы на цэлы рад сапраўдных труднасьцей, такога становішча з тэмпамі ў тэатрах не існавала-б, калі-б некаторыя кіраўнікі іх не паддаваліся часамі гэтым трудносьцям, а перамагалі-б іх.

Той факт, што вытворчая праграма тэатраў ня выканана, зьяўляецца адной з асноўных прычын цяжкага матар'яльна-грашовага становішча раду тэатраў (ЯДТ, БДТ-II). Але гэта ня ўсё. Справа ня толькі ў тым, што малая колькасьць новых паказаў тэатраў не магла прыцягнуць адпаведных мас гледачоў, а справа таксама ў якасьці гэтых паказаў. Рост якасьці нашых тэатраў ні ў якай меры ня можа нас задаволіць.

З апошніх трох новых паказаў БДТ-1 «Бацькаўшчына», бязумоўна, зьяўляецца паказальнікам росту тэатру і рашучай перабудовы яго калектыву. Астатнія два — «Лён» і «Зямля і неба», як гэта ўжо адзначала наша крытыка, могуць быць залічаны ў разрад «серадняцкіх», прымаючы пад увагу ступень культуры данага тэатру.

Калі ўзяць ЯДТ, дык апошнія яго паказы таксама маюць рад істотных недахопаў. Пастаноўка «Партызанаў» ня можа быць залічана, як значны далейшы ўклад у гэты багаты магчымасьцямі тэатр. Гэты паказ пабудован на слабым літаратурным матар'яле і мае рад іншых дэфэктаў, якія зьніжаюць яго якасьць. Аналёгічнае становішча з якасьцю трэба адзначыць і ў паказе «Замежная калегія». Што-ж датычыць апошняй прэм'еры тэатру — «Віндзорскія свавольніцы», дык тут пастаноўчыкі зрабілі ўсё, каб адагнаць гледача і сказіць ленінскае разуменьне крытычнага асваеньня спадчыны буржуазнай культуры.

Можна было-б прывесьці яшчэ рад прыкладаў, але і гэтых хопіць, каб адзначыць невыстарчальную работу кіраўніцтва нашых тэатраў над узьняцьцем ідэйна-мастацкага зьместу тэатраў, пад задаваленьнем патрабаваньняў культурна-ўзросшых мас нашай краіны.

Правая небясьпека, якая выяўляецца ў гэтым выпадку ў фармалістычным ухіле, яшчэ ў большай ступені небясьпечна для нашай тэатральнай культуры і бытае актора. У БДТ-I паказ п'есы Мікітэнкі быў зьвяз за фармалістычны падыход. Паказ Шэкспіраўскай п'есы «Віндзорскія свавольніцы» ў ЯДТ таксама зьяўляецца фармалістычным штукарствам, эстэцкім выпустошваньнем ідэйнага зьместу рэчы, нарагаджэньнем фармалістычных выкрутасаў і «эфэктаў». Фармалізмам у значнай ступені аддае і паказ «Напор» у БДТ-II.

Перанясьненьне цэнтру цяжару на знадворную абстаноўку, на так званыя рэчавыя кампаненты паказу (канструкцыя, музычнае афарміленьне, гарнітуры, сьветавыя эфэкты і г. д.) зьяўляецца асноўнай перашкодай на шляху росту нашага актора, на шляху «шэкспірызацыі» (выраз Маркса) тэатру, г. зн. на шляху ператварэньня тэатру ў жывое рэалістычнае люстра нашай барацьбы, нашых перамог і імкненьняў, барацьбы за поўную пабудову сацыялістычнага грамадзтва, фармалістычнае захапленьне вельмі часта выцісьнае майстэрства, ігру акторскага складу, ставячы актора ў становішча прыслужніка іншых «рэчавых» кампанэнтаў. У выніку гэтага актор замест жывога пераканаўчага вобразу дае хадульную фігуру.

Няправільнае разуменьне задач тэатру на даным этапе знайшло таксама адлюстраваньне і ў працы над клясычнай драматургіяй. ЯДТ намеціў тры паказы засаб з клясыкі. БДТ-I працуе над клясыкай, таксама і БДТ-2. Тэатр оперы і балету вымушаны працаваць над клясыкай з-за адсутнасьці сучаснага адпаведнага оперыага матар'яду. Але бяда ня ў тым, што нашы тэатры працуюць над клясыкай. Працаваць над клясыкай патрэбна і карысна. Справа ў тым, што да гэтай задачы часта падыходзяць па-эстэцку, фармальна, вузка-«акадэмічна». Прыступаючы да працы над клясыкай, некаторыя нашы тэатрапаўнікі забылі неабходную прапорцыю паміж клясыкай і матар'ялам на сучасныя тэмы. Іншыя лічылі, што клясыка ёсьць толькі матар'ял для вучобы актора, забываючы, што паказ у тэатры перш за ўсё прысьвечан інтарэсам гледача.

Тое, што мы бачылі ў нашых тэатрах з клясыкі, часта паказвалася гледачу недароблены, без належнай прадумаласьці эпохі, без неабходнай глыбіні. З клясычным паказам нельга «сьпяшацца». Трэба культурна ўзброіцца рэжысеру і актору, каб аўладаць гэтай спадчынай і перамагчы яе буржуазны зьмест. Некаторыя рэжысеры зусім не спраўляюцца з гэтай задачай і вельмі часта ў сваёй трактоўцы эпохі скочваюцца да ідэалізацыі буржуазных клясаў.

Усё гэта гаворыць аб вялікай небясьпецы справа. Існуе таксама рад прарываў нацыяналістычнага парадку. У некаторых тэатрах сярод работнікаў ёсьць настрої амніставаньня свайго нацыяналістычнага мінулага, прычым такі ход назад яны хочуць угрунтаваць пастановай ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурна-мастацкіх арганізацый. Пад фальшыва-нацыянальным сьцягам асобныя працаўнікі адмаўляюць магчымасьць інтэнсыўнага скарыстаньня ў нашых нацыянальных тэатрах твораў расійскай і іншай «неарыгінальнай» драматургіі.

«Ліквацкія» загібы ў галіне тэатру асабліва выразна адбіліся ў працы нашых ТРАМ'аў, якія часта ўводзілі, як дадатнае, бяскультурнасьць і «лякіроўку рачаіснасьці».

Што датычыць халтуры, то гэтым «дабром» нас часта забясьпечваюць розныя тэатральныя калектывы, якія прыяжджаюць па прыватнай дагаворанасьці з мясцовымі тэатрамі і адраджаюць «нацыянальную экзотыку» накшталт «Наталкі-Палтаўкі», «Кэрэмэлюкаў», распаўсюджваючы абываталышчыну і г. д.

Усё гэта гаворыць аб наяўнасьці раду небясьпек, якія патрабуюць бальшавіцкай барацьбы за савецкі тэатр. Трэба сказаць, што хоць і ёсьць рад дасягненьняў у сэнсе наближэньня да савецкай улады старых тэатральных кадраў, але дагэтуль у тэатрах яшчэ ня зжыты канчаткова «стары» дух тэатральных «традыцый», мяшчанска-інтэлігэнцкага індывідуалізму, абыякавасьці ў грамадзкім жыцьці, нагоня за знадворнай бліскучасьцю і парадкасьцю.

У сучасны момант кіруючыя органы, партыйная, савецкая і прафэсыянальная грамадзкасьць павінны прысьвяціць на дапамогу тэатрам канкрэтнай справай. Трэба абавязкова адзначыць працу культпалітсавету пры тэатрах, як органаў, праз якія пралетарская грамадзкасьць ажыцьцяўляе сваю дапамогу тэатрам у галіне барацьбы за ідэйна-мастацкую якасьць. Неабходна правесьці рад мерапрыемстваў па стварэньні арыгінальнай драматургіі. Неабходна больш шырока скарыстаць друк у барацьбе за паляпшэньне працы тэатраў і за папулярызацыю іх дасягненьняў. Трэба разгарнуць шырокую самакрытыку ўнутры тэатраў і разьбіць элемэнты групоўшчыны, склоччыцтва, якія там ёсьць, ударыць па рэшках буржуазных і нацыяналістычных тэорый. Трэба шырэй разгарнуць у тэатрах сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

* * *

Нямалаважным пытаньнем у сучасны момант зьяўляецца праблема матар'яльна-грашовая. З дзяржаўнага бюджэту тэатры БССР у гэтым годзе атрымліваюць датацыю ў суме звыш мільёна рублёў. Гэта — лепшы паказальнік увагі партыі і савецкай улады да тэатральнага фронту.

Выходзячы з даходных магчымасьцей, пры дзяржаўнай датацыі, тэатры і павінны будаваць сваю працу.

Аднак, на сёнешні дзень рад тэатраў, як ужо было сказана, перажываюць грашовыя труднасьці, а рэшта (за выключэньнем расійскага дзяржтэатру і БДТ-3) працуюць з вялікім напружаньнем. Адна з прычын гэтага — адсутнасьць выстарчальнага рэпэртуару. Другая прычына — аслабленьне ўвагі пралетарскай, прафсакраднай грамадзкасьці да нашых дзяржаўных тэатраў. Ёсьць і рад выпадкаў простай недаацэнкі ролі нашых тэатраў, ёсьць рад фактаў вялікадзяржаўніцкіх адносін да нашых беларускіх тэатраў пад шыльдай «інтэрнацыяналізму». Напрыклад, некаторыя арганізацыі з Віцебску («Сьцяг індустрыялізацыі» і інш.) адмовіліся ад закупленых імі паказаў БДТ-2 на «падставе»... пастановы пленуму ЦК КП(б)Б аб нацыяналізыцы (заява тав. Кудзелькі — дырэктара тэатру). Дырэктар Бабруйскага тэатру Уланаў намаляваў у сябе плякат, на якім памяшканьне Бабруйскага тэатру загароджана калючым дротам ад дзяржаўных тэатраў БССР.

Дырэктар Магілёўскага тэатру т. Бернардаў катэгарычна адмаўляецца цярпець у сваё памяшканьне нашы тэатры, бо яны быццам-бы нерэнтабэльныя, бо, напрыклад, такі тэатр, як польскі, ня можа спадзявацца на гледача, бо ў Магілеве, паводле яго слоў, хоць касьцёл і ёсьць, але польскага насельніцтва ўсяго толькі 150 чалавек...

Побач з акцыявізацыяй мясцовых нацыяналістаў мы бачым таксама ажыўленьне ў БССР вялікадзяржаўніцкіх элемэнтаў — гэтых прадстаўнікоў галоўнай небясьпекі ў нацпытаньні. Мы бачым іх ажыўленьне і на тэатральным фронце.

З другога боку, нашы дзяржаўныя тэатры аслабілі сваю сувязь з масай рабочага гледача, слаба прыстасоўваюць сваю «гаспадарку» з-за адсутнасьці гібкасьці да абстаўін БССР. Грамоздкасьць паказаў, канструкцыі, якрытычныя насьледваньні — вельмі часта няздалыя — маскоўскіх тэатраў у сэнсе багацьця афарміленьня паказаў і г. д., — усё гэта адмоўна адбіваецца на бюджэце тэатраў, на іх паваротлівасьці ў сэнсе перасоўваньня, на магчымасьці скарыстаньня іх у радзе гарадоў БССР, куды зараз стацыянарныя тэатры не заяжджаюць. Адсоль—звужваньне тэатральнага рынку, скарачэньне дзейсна-карыснага пэрыяду працы кожнага з іх і г. д.

У нашых тэатрах даволі часта наглядаюцца недапушчальныя адносіны да дзяржаўных грошай. Некаторыя кіруючыя таварышы нават пакрыўджаны ў глыбіні сваіх лепшых пачуцьцяў тымі мерапрыемствамі, якія зараз ажыцьцяўляе Наркамасьветы, каб увесь ці рэжым эканоміі ў тэатрах і наогул упарадкаваць грашовую частку. Лічаць, што ўмешваньне Наркамасьветы ў пытаньні акрэсьленьня складу людзей і г. д. ёсьць парушэньне «сьвятая сьвятых» мастацкіх кіраўнікоў. Гэта зусім няправільна. Зразумела, Наркамасьветы не павінен і ня будзе займацца дробнай апекай над тэатрамі. Наадварот, ён будзе забясьпечваць максымальную ініцыятыву нашым таленавітым тэатрапаўнікам, але разам з гэтым, будзе ўкараняць у тэатры і грашовую дысцыпліну,

МТС АБАВЯЗАНЫ УЗЬНЯЦЬ ТЭМПЫ І ЯКАСЬЦЬ СЯЎБЫ

ІЛЬНАВОДЧЫЯ МТС ЗУСІМ МАРУДНА РАЗГОРТВАЮЦЬ СЯЎБУ ІЛЬНУ

АСАБЛІВА АДСТАЮЦЬ СІРОЦІНСКАЯ, СУРАСКАЯ, АСЬВЕЙСКАЯ, ДУБРОВЕНСКАЯ І ГАРАДОЦКАЯ МТС

ЗВОДКА ІЛЬНАТРАКТАРАЦЭНТРУ АБ ХОДЗЕ СЯЎБЫ ІЛЬНУ НА 5 МАЯ

МТС	Засеяна яравых у проц	У тым ліку ільну: Засеяна у га	У тым ліку ільну: проц. пляну
Боркавіцкая	6,1	83	3,8
Ветрынская	21,9	111	4,9
Дрысенская	6,0	70	3,0
Лепельская	19,6	389	10,9
Асьвейская	0,8	14	0,8
Расонская	8,1	70	8,2
Вушацкая	12,1	65	3,6
Бешанковіцкая	8,9	241	15,1
Сіроцінская	3,5	10	0,5
Чашніцкая	16,0	158	11,2
Крупская	6,6	68	4,2
Балыніцкая	5,8	51	4,0
Горацкая	0,8	58	1,7
Гарадоцкая	1,8	27	1,5
Дубровенская	0,4	40	1,4
Лёзьнянская	5,4	576	12,8
Мсьціслаўская	1,5	74	2,2
Сураская	0,2	12	0,5
Сеньненская	15,7	511	14,1
Талачынская	5,7	149	10,2
Чавуская	11,6	45	8,7
Шклоўская	4,5	78	2,7
Мехаўская	2,6	86	2,0
УСЯГО:	7,6	2.925	5,5

РУЛЬ У ВАРОЖЫХ РУКАХ

СІРОЦІНА, 8.

Раённая МТС налічвае 30 трактароў. 28 машын знаходзяцца на вытворчых вучастках. Два трактары накіраваны на паўторны рамонт.

Запытайцеся ў дырэкцыі МТС:

— Колькі ўзарана трактарамі?

Вам адкажуць:

— От, глупства. Няма аб чым і гаварыць...

Да 4-га мая за выключэньнем аднаго Лоўжанскага вучастку ворыва яшчэ нават... НЕ ПАЧЫНАЛАСЯ. Стаяць машыны.

Прычыны?

Атрапой МІХЛІНА адкрыта заяўляе:

— Арыць трактарамі яшчэ нельга!

Знаёмая кулацкая песьня. Міхліна не адна: з ёй салідарны і іншыя работнікі МТС. Уся бяда, па іх думцы, ... ад прыроды. Прычым-жа тут людзі?

Паглядзімо...

На пяшчаным загончыку сядзібнага вучастку МТС, вось тут-жа на вачох у дырэкцыі ораліва стаіць у баразьне ТРАКТАР № 13. Каля трактара варушацца механік Шабанаў і трактарыст Берасьнёў.

Трактар разобран. У адным месцы валяецца радыятар, у другім—карбюратар, у трэцім—бак для гаручага, у чацьвертым—руль. Не пачаўшы работы, машына стала ўжо ў рамонт. Трактар прастаяў у баразьне 3 мая дзень і ноч і чацьвертага—да поўдня.

Чаму?

Механік Шабанаў дае тлумачэньні:

— Пракладка верхняй крышкі блёку прапускае ваду ў цыліндры. Трапіць вада—злучацца электроды ў ізвечах.

Вось і стаіць. Зга мая падправілі пракладку. Завялі матор: Пусьніі. Аж тут... зноў вада пацякла. Заглушылі матор. Разабралі. Яшчэ раз пераладжылі. Пусьцілі 4 мая з паўдня.

Пашоў трактар.

— Ці надоўга?—з непакоем пытае Шабанаў.

Стаяў гэты трактар, зразумела, не таму, што ён дрэнны, а таму, што адносіны да яго проста злачынныя. Машыне патрэбен добрасумленны рамонт і добрасумленны вадзіцель. Ні першага, ні другога ня меў і ня мае трактар № 13.

Шабанаў шчыра прызнаецца:

— Рамонт у майстэрні быў дрэнным. Мы дадаем:

— І на полі таксама.

Трактарыст Берасьнёў, вадзіцель трактара № 13, енчыць:

— Не магу працаваць... Не разумею машыны.

Няпраўда. Берасьнёў працуе ўжо другі год. Не навічок. Але ён гультайнічае. Сабатуе. Ад гэтага і дерпіць трактар.

Не ў надвор'і, ня ў глебе, не ў трактарох справа. Глеба ўжо сухая. Працаваць можна мінімум 20 гадзін у суткі. Справа ў людзях.

У калгасе «Чырвонае Крупчына» трактарыст Лукін спусьціў трактар у... сажалку. Два дні 7 чалавек цягнулі адтуль машыну.

Трэба правяць кіраўніцтва і склад МТС, трэба пільна прыглядзецца, каго ў Сіроціне пасадзілі за руль.

А. М.

2 ГЭКТАРЫ ЗА 17 ДЗЁН

ВЕТРЫН, 7.

ВЕТРЫНСКАЯ МТС на 5 мая выканала плян сяўбы ільну ўсяго толькі на 4,9 ПРОЦ.

Чаму МТС так марудна праводзіць сяўбу? Дырэкцыя знаходзіць шмат рознастайных аб'ектыўных прычын. І асабліва часты спасыланьні на нібы дрэннае надвор'е.

Даволі прасачыць за работай вытворчых вучасткаў, каб стала яснай сапраўдная цана гэтых апраўданьняў.

Возьмем Літвінаўскі вучастак, дзе працуе трактарная калёна № 7. Калёна абслугоўвае 9 калгасаў і павінна апрацаваць 778 гэктараў.

Трактары былі накіраваны на вучастку без папярэдняй праверкі. Калёна, вышаўшы на поле... стала. Тады апамяталіся, пачалі высьвятляць, у чым справа. І аказалася: трактары ад рамантаваны настолькі дрэнна, што патрэбен ПАЎТОРНЫ РАМОНТ. А ў выніку—запыжка палівных работ.

Як праходзіць ворыва?

Даволі ўказаць толькі на адзін факт самоўпу факт. Тры трактары з калёны № 7 за 17 дзён узаралі... 2 га і забаранавілі... 8.

Нікуды ня вартая дысцыпліна—першая і асноўная прычына такіх ганебных тэмпаў. На полі працуюць столькі, колькі хто захоча. Ні адзін трактарыст нічога ня ведае пра нормы выпрацоўкі і выдаткаваньне гаручага.

Брыгадзір вучастку ЗАБЛОЦКІ шчыра прызнаецца, што работа трактарыстаў зусім ня ўлічваецца. Колькі выпрацоўвае той ці іншы трактарыст, колькі ён выдаткоўвае гаручага—невядома.

— Такога ўліку няма,—заяўляе Заблоцкі.

Нова арганізаваны палітаддзел абавязан рашуча выправіць буйнейшыя недахопы ў рабоце машына-трактарнай станцыі.

БАГДАНАЎ.

ХОД СЯЎБЫ ПА МАШЫНА-ТРАКТАРНЫХ СТАНЦЫЯХ

ПА ЗБОЖЖАВЫХ МТС

ЗАСЕЯНА ЗБОЖЖАВЫХ КУЛЬТУР У ПРОЦАНТАХ

1 МАЯ	5 МАЯ
49 ПРОЦ. ПЛЯНУ	75,3 ПРОЦ. ПЛЯНУ

ПА ІЛЬНАВОДЧЫХ МТС

ЗАСЕЯНА ІЛЬНУ У ПРОЦАНТАХ

1 МАЯ	5 МАЯ
3,3 ПРОЦ. ПЛЯНУ	5,5 ПРОЦ. ПЛЯНУ

Сяўба яравых па МТС праходзіць зусім НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧА.

Асабліва адстаюць ІЛЬНАВОДЧЫЯ МТС. Да 5 мая па сыстэме Ільнатрактараўцэнтру (дырэктар т. ПУШЧЫН) плян сяўбы ільну выкананы усяго на 5,5 проц. Засеяна толькі 926 га.

За першыя пяць дзён мая ільнаводчыя МТС дабіліся зусім ніччамнага прыросту — усяго ў 2,1 проц. Ганебныя вынікі. Тым больш ганебныя, што агульны процант выкананьня пляну сяўбы ільну па рэспубліцы вышэйшы, чым па ільнаводчых МТС.

Фактычна масавая сяўба ільну па МТС яшчэ НЕ РАЗГАРНУЛАСЯ. Даволі ўказаць, што па 17 машына-трактарных станцыях—БОРКАВІЦКАЯ, ЗЕТРЫНСКАЯ, ДРЫСЕНСКАЯ, АСЬВЕЙСКАЯ, РАСОНСКАЯ, СІРОЦІНСКАЯ, ГОРАЦКАЯ, ГАРАДОЦКАЯ, ДУБРОВЕНСКАЯ і г. д. — плян сяўбы ільну выканан толькі ад 0,5 да 4 проц.

І гэта зараз, калі кожны дзень, кожная гадзіна вырашае посьпех барацьбы за высокі ўраджай ільну.

У руках МТС усе магчымасьці для таго, каб у тэрмін і добра засеяць лён. Прычыны ганебнейшых тэмпаў выключна ў дрэннай арганізацыі сяўбы, у кіраўнічай растаноўцы сіл, у апартуністычнай стаўпы на самацёк.

Возьмеце СІРОЦІНСКУЮ МТС. Палі, якія павінны быць ужо ўзараны, яшчэ нават ня крапуты плугам. Кіраўнікі МТС у адзін голас абвінавачваюць ва ўсім... надвор'е. Факты сьведчаць аб іншым. Надвор'е ні ў чым не вінавата. Глеба даўно падсохла і ворыва можна разгортваць поўным ходам. Вінаваты жывыя людзі, вінаваты кіраўнікі МТС. Трактарны парк станцыі — у самым кепскім стане. Трактары больш стаяць, чым працуюць.

Ня менш яркай ілюстрацыяй зьяўляецца работа ВЕТРЫНСКАЯ МТС. Нікуды нягодная дысцыпліна і поўная абязь лічка сталі законам у гэтай машына-трактарнай станцыі. Трактары за вучасткамі не замацаваны. Калгасы чакаюць машыны, трэба арыць, трэба сеяць, а аказваецца, трактары перакінуты за дзесяткі кілёмэтраў нуды, дзе яны непатрэбны. Безадказнасьць, якая мяжуе з простым шкодніцтвам!

Трактарысты працуюць усьлепую. Нормы выпрацоўкі да іх не давядзены. Кожны арэ стоўкі, колькі яму ўзадумаецца. Няма нічога дзіўнага, што Ветрынская МТС выканала плян сяўбы ільну да 5 мая толькі на 4,9 проц.

Як рэагуе на гэтыя зусім непрыгожыя факты Ільнатрактараўцэнтр? Якія меры ён прыняў, каб забясьпечыць штодзённы ціль і выразнае апэрацыйнае кіраўніцтва сяўбой на ільнаводчых машына-трактарных станцыях.

Адно можна адказаць—Ільнатрактараўцэнтр акуратна складае зводкі. І толькі!

10 МАЯ

Нельга больш цярпець ні адной мінуты такога становішча. Трэба з усёй сілай усьвядоміць, што сваячасовая сяўба ільну — пад сур'ёзным ударам.

Максымальна выкарыстаць кожны трактар, правільна расставіць сілы на вытворчых вучастках, у калёне, брыгадзе, устанавіць жорсткі кантроль за тэмпамі і якасьцю, шырока разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва сярод трактарыстаў — вось у чым баявая задача, вось куды ў першую чаргу павінны кінуць свае сілы нова арганізаваныя палітаддзелы пры МТС.

ЦК і СНК прапанавалі ўстанавіць цьвёрдыя дзённыя заданьні для кожнага вучастку, калёны, брыгады. Трэба ня толькі ўстанавіць гэтыя заданьні, але і арганізаваць самы дакладны кантроль за іх выкананьнем.

Пераадолеем МТС ЗАХОДНЯЯ ВОБЛАСЬЦІ па-бальшавіцку разгортваць масавую сяўбу ільну. Па многіх калгасах плян сяўбы ільну ўжо далёка выкананы. Учора мы адзначылі ўдарную работу калгасу «ПРОЛЕТАРИЯ», які ад'ным з першых у вобласьці засеяў увесь лён і тым зьяўляецца кандыдатам на абласную премію за баявое праведзеньне сяўбы.

Такіх прыкладаў у нас яшчэ амаль няма. Толькі паасобныя калгасы Лёзьнянскага раёну, па-бальшавіцку разгарнуўшы сацыялістычнае спаборніцтва, дабіліся датэрміновага выкананьня пляну сяўбы па ільну, напрыклад, калгас «Беларуская вёска».

А мы-ж, наша рэспубліка, прыступілі да сяўбы ільну значна раней Заходняй вобласьці. Значыць, да нас і БОЛЬШЫЯ ПАТРАБАВАНЬНІ. Значыць, мы можам і абавязаны ХУТЧЭЙ СКОНЧЫЦЬ СЯЎБУ ІЛЬНУ.

Шырокім разгортваньнем сацыялістычнага спаборніцтва, ачышчаючы МТС ад клясава-варожых элементаў, палітаддзелы павінны забясьпечыць ударнае выкананьне гэтай вялікай і ганаровай задачы.

У сыстэме трактараўцэнтраў першае месца па тэмпах сяўбы займаюць ЗБОЖЖАВЫЯ МТС. Па збожжавых культурах станцыі Збожжатрактараўцэнтру (дырэктар т. ДУБОЎСКІ) ужо дасягнулі 75 проц. пляну. Паасобныя МТС ня толькі выканалі, але і перавыканалі плян сяўбы збожжавых культур.

У першых радах ідуць СЛУЦКАЯ, ЛЕЛЬЧЫЦКАЯ, ТУРАЎСКАЯ і іншыя МТС, якія ня толькі выканалі, але і ПЕРАВЫКАНАЛІ плян сяўбы па збожжавых культурах, засеяўшы ў сярэднім увесь свой яравы клін ад 45 да 60 проц.

Аб чым гаворыць гэты факт? Аб тым, што 75 проц. пляну па збожжавых культурах на 5 мая — ЗУСІМ НЕВЫСТАРЧАЛЬНЫ, ЗУСІМ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ РЭЗУЛЬТАТ для МТС Збожжатрактараўцэнтру. Здолелі-ж пераадолець МТС ужо яго толькі выканаць, але і перавыканаць свае пляны сяўбы.

Разгорнуць зьнянацку тэмпы і якасьць сяўбы, каб ня толькі збожжавыя, але ўвесь яравы клін неадкладна і поўнасьцю засеяць — такая ўдарная задача.

Зусім нецярпімым зьяўленьнем адстаюць МТС Бульбатрактараўцэнтру (дырэктар т. ГРЭБЕНЧЫК).

Да 5 мая МТС Бульбатрактараўцэнтру выканалі плян сяўбы яравых толькі на 23,7 проц. Прырост за першыя 5 дзён мая — усяго 9,1 проц. Плян сяўбы па бульбе выкананы ад 5 мая на 5,4 проц. І гэта — па раённай бульбе.

Няма ніякага апраўданьня такім тэмпам сяўбы. Уся справа вызначна ў якасьці работы МТС, у якасьці апэрацыйнага кіраўніцтва з боку Бульбатрактараўцэнтру.

Зірнеце на работу, напрыклад, ГОМЕЛЬСКАЙ і РЭЧЫЦКАЙ машына-трактарных станцый. І Гомельская, і Рэчыцкая МТС неадвальняюча праводзяць сяўбу. У той-жа час у гых-жа самых МТС паасобныя вытворчыя вучасткі паказваюць сапраўды ўдарныя тэмпы ворыва і сяўбы (гл. карэспандэнцыі з Рэчыцы і Гомелю ў сёньнішнім нумары «Зьвязды»).

Адны і тыя-ж магчымасьці, адны і тыя-ж МТС — розная работа, розныя вынікі. Яркі факт, які з усёй сілай выкрывае сапраўдны зьмест «аб'ектыўных» прычын.

АСАБЛІВАЯ ЎВАГА — правільная расстаноўцы трактарнага парку на палёх. А тут у радзе МТС мы маем факты простага шкодніцтва, аб чым сваячасова сыгналізавалі палітаддзелам і партарганізацыям ЦК і СНК і сваёй апошняй пастанове аб ходзе сяўбы. Заключаецца гэта ў тым, што трактары пасылаюць на тыя вучасткі, дзе работы шчыра праводзіць нельга. Высокія падсохшыя вучасткі адмаўляюць пад кожнае ворыва, а нізкія залітыя вадой мясціны — пад трактары. У Гомельскай МТС трактарную калёну накіравалі на вучастак... заліты вадой. Цэлую калёну трактары прасталі. І гэта ў той час, калі на суседніх вучастках нож на было поўным ходам разгортаць трактарнае ворыва.

З такімі зьявамі трэба бязьлітасна змагацца. Правільна расставіць трактарны парк, значыць забясьпечыць поспех сяўбы.

Шырока разгортваючы сацыялістычнае спаборніцтва ў МТС Зах. вобласьці, кожны машына-трактарны станцыі павінны паказаць узор хуткага і добрага праведзеньня сяўбы.

РАЎНЕНЬНЕ НА ПЕРАДАВІКОЎ СЯЎБЫ

ЛЕЛЬЧЫЦКАЯ, СЛУЦКАЯ, ХОЙНІЦКАЯ, ДАМАНАВІЦКАЯ, ТУРАЎСКАЯ І ТАНЕСКАЯ МТС ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЛІ ЗБОЖЖАВЫЯ

ЗВОДКА ЗБОЖЖАТРАКТАРАЦЭНТРУ НА 5 МАЯ

МТС	Засеяна збож. У тым ліку аўсы: У га	У проц.	Проц. пляну
Вягомльская	1481	29,1	27,4
Плешчаніцкая	1040	27,8	13,8
Лагойская	628	16,1	19,2
Пухавіцкая	2805	56,2	63,1
Вузьдзенская	2611	60,4	58,1
Капыльская	4087,8	71,4	96,8
Танежыцкая	2579	73,1	101,3
Слуцкая	4807	102,5	103,2
Ст.-Дароская	1184	54,5	87,5
Старобінская	2750	75,6	98,4
Хойніцкая	2895	91,7	102,6
Даманавіцкая	2032	82,5	101,5
Лельчыцкая	837	48,6	108,2
Тураўская	1140,7	95,0	105,6
Жыткавіцкая	1651	52,0	81,4
Любаньская	2592	67,6	100,3
УСЯГО:	34555,4	61,5	75,3

АДНА МТС—РОЗНАЯ РАБОТА

ГОМЕЛЬ, 7. (Ад нашага спэцыяльнага карэспандэнта).

Па 22 калгасах ГОМЕЛЬСКАЯ МТС на 5 мая засеяна 1.774 га—40 проц. яравога кліну. Нават раньнія збожжавыя культуры, як аўс, яшчэ не засеяны поўнасьцю.

Трактарамі трэба ўзараць 1.224 га, прадыскаваць 280 га і засеяць—300 га. Плян зусім рэальны, пры добрай арганізацыі працы ён можа быць нават перавыкананы. Між тым з 20 красавіка да 5 мая 16 трактараў узаралі ўсяго 313 га, прадыскавалі—130 га і засеялі 28 га.

Кіраўніцтва трактарнымі атрадамі пучана на самацёк. Трактары па атрадах дырэкцыя МТС разьмеркавала механічна. Трактары пасылаюцца куды попала, нават на вучасткі, зусім не падрыхтаваныя да работы. У вёсны Бабовічы, куды накіравана трактарная калёна, глеба была заліта вадой. Трактары прасталі без работы 10 дзён. У гэты-ж самы час трактары палкам можна было скарыстаць у вёсны Жаробіна, дзе глеба поўнасьцю была падрыхтавана для ворыва.

Як працуюць трактары зараз, у самы разгар палівных работ?

На першым Бабовінкім вучастку два трактары за 31 гадзіну замест 4,96 га ўзаралі толькі 4,56 га. 5 гадзін было згублена на дарэмныя перагоны і перасевы. Гаручага замест 134 клг. выдаткавалі 143.

На другім Бабовінкім вучастку два трактары за 43 гадзіны ўзаралі 5,53 га замест 6,88, прычым перавыдаткавалі 29 клгр. гаручага.

Да гэтага трэба дадаць, што трактары працуюць, як правіла, менш 16 гадзін.

На фоне дрэннай работы ўсяго трактарнага парку МТС рэзка вылучаецца, як перадавая, трактарная калёна Клімаўскага вучастку. Тры трактары гэтай калёны за 40 гадзін узаралі замест 7,2 га — 7,7 га. Пры гэтым з'эканоміл 4,5 клг. гаручага. Трактарысты Артамонаў, Цітоў, Катляроў, Дарожанка. Пудзікаў і брыгадзір Канавалаў штодзённа перавыконваюць нормы. Ворыва на гэтым вучастку таксама добраякаснае. Глыбіня—ня менш 15-16 сантыметраў.

На жаль, формы і мэтады работы трактарыстаў Клімаўскага вучастку не перанесены ў адстаючыя.

Кіраўніцтва Гомельскай МТС павінна неадкладна перабудаваць работу трактарных атрадаў.

АРК. ЗАРУБЕЖНЫ.
П. КАЛАМІЕЦ.

БЕЗ ПРАСТОЯЎ, АВАРЫЙ, АГРЭХАЎ

УДАРНЫ ТРАКТАРНЫ АТРАД

РЭЧЫЦА, 7.

Трактарны атрад таз. ЖДАНОВІЧА—адзін з лепшых у Рэчыцкай МТС. Тут машына сапраўды абкружана любоўю і клопатамі з боку кожнага трактарыста. За машынай пільна сочаць, не дапускаюць аварый і паломак. Малейшая няспраўнасьць загадзя выпраўляецца. Трактары заўсёды чыстыя, таг і бліскаць.

Загадчык вучастку таз. Жлановіч і лёнаважатыя заўсёды знаходзяцца на месцы работы ў полі.

Стаў трактар, занарыўся, — загадчык вучастку або калёнаважаты адразу-ж дапамагаюць трактарысту ладзіць машыны. Рамонт робіцца тут-жа на полі ў баразьне.

Характэрна, што прыкмавалы на вучастку механік тут ня бывае, ён працуе на другім вучастку.

— Ды ён нам і не патрэбен, — заяўляюць трактарысты. У нас калёнаважатыя і загадчык вучастку самі робяць рамонт.

Трактары амаль ня ведаюць прастояў. Як толькі Жлановіч заўважыць, што гаручае ўжо канчаецца, ён адразу-ж пакланяціцца, каб падвезьлі новае.

— На нашта ворыва ніхто не пасягдзіцца, — з гонарам заяўляе Жлановіч.

І сапраўды, на палёх калёны няма агрэхаў. Баразны так і ляглі роўнымі істужкамі.

Калёна паставіла перад сабой задачу — да 1 мая скончыць работу на вучастку. Абавязацельства не засталося пустым словам, яно з гонарам выканана. Пасля трактарыстамі разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва. Трактарыст Глебаў на «Фардзоне» за зьмену ўзораў да 2 га замест 1,5 паводле заданьня. Трактарыст Сівуга ўзораў на «Інтары» па 3,14 га замест вызначаных 3.

Ці перанесен вопыт работы калёны Жлановіча на ўсе іншыя вучасткі, ці стаў ён здабыткам усіх трактарыстаў Рэчыцкай МТС.

На гэта пытаньне лепш за ўсё адказваюць лічбы. На 1 мая трактары МТС узаралі ўсяго каля 300 гэктараў, што складае каля 25 проц. заданьня.

Самым адстаючым вучасткам зьяўляецца калёна № 3. Да 10 мая яна навіна ўзараць 431 га, узарала-ж усяго 41 га. З 6-ці трактараў працуюць толькі 4. Два на віне трактарыста выведзены са строю. Нормы ворыва рэгулярна ня выконваюцца. Якасьць апрацоўкі глебы нікуды ня вартая.

Загадчык гэтага вучастку Маторны і агранам Завадзкі на полі амаль ніколі ня бываюць. Работай трактараў ніхто ня кіруе. Калёна мае вялікі перавыдатак гаручага. Кантролю за выдаткаваньнем гаручага няма.

Два вучасткі в адноль каявымі ўмовамі, але вынікі, як віцаць, зусім розныя, процілеглыя. На прыкладзе іх работы мы бачым, што посьпех работы МТС і правільнае скарыстаньне трактарнага парку залежыць выключна ад людзей, ад сапраўды бальшавіцкага і апэрацыйнага кіраўніцтва.

Д.

ДОШКА ГОНАРУ

КАЛГАСЫ БССР, ЯКІЯ ДАТЭРМІНОВА І ПОЎНАСЬЦЮ ЗАСЕЯЛІ ЎСЕ ЯРАВЫЯ

1. Калгасы „Чырвоны пагранічнік", „Трэці рашаючы" і „Чырвоныя кветкі" (Старобін). Калгас „Чырвоны пагранічнік" поўнасьцю засеяў яравы клін да 1 мая.

2. Калгасы „Чырвоны будаўнік" і „Чырвоны маяк" (Слуцак). Сяўба яравых праведзена за 8 дзён. Плян па ўсіх культурах поўнасьцю выканан.

3. Калгас імя АДПУ (Менскі раён). Сяўба яравых скончана 7 мая. Засеяна 205,95 га—109,4 проц. пляну.

4. Калгас „Чырвоная слабада" (Лёзна). 8 мая калгас першым у раёне засеяў усе яравыя культуры.

ШАЎРОУ

Супроць спэкуляцыйна-нэпманскіх тэндэнцый у гандлёвым апараце

Студзеньскі аб'яднаны пленум ЦК і ЦКК УсеКП(б) абавязаў усе партыйныя, савецкія і гаспадарчыя арганізацыі забясьпечыць захаваньне самай суровай фінансавай дысцыпліны і рэжыму эканоміі, цьвёрда і няўхільна праводзіць гаспадарчы разрахунак.

Партыя асабліва востра ставіць пытаньне аб правільным і эфэктыўным расходаваньні сродкаў, бо ўсякая фінансавая расхлябанасьць, напляваньне ў адносінах да савецкай капейкі прыносяць вялізарную шкоду народнай гаспадарцы, падрываюць народна-гаспадарчыя пляны.

У паасобных зьвеньнях савецкага і кааперацыйнага апарату назіраецца простае ігнараваньне дырэктыў партыі, нежаданьне змагацца за эканомію сродкаў, за гаспадарчы разрахунак.

У гэтых адносінах асаблівай увагі заслугоўвае сыстэма Белкаапсаюзу, дзе ўзровень выдаткаў звароту надзвычай вялікі.

Факты, выяўленыя за апошні час органамі РСІ, гавораць аб тым, што ў выніку апартуністычнага благадушша раду кааперацыйных работнікаў, у выніку безгаспадарчасьці, слабай рэвалюцыйнай пільнасьці да раскрадальнікаў грамадзкай маемасьці на працягу 1932 году па сыстэме Белкаапсаюзу перавыдаткавана 19,5 млн. руб. пры агульным раздробным звароце ў 468,5 млн. руб. Такім чынам, выдаткі звароту складаюць 12,8 проц. замест 9,07 проц., прадугледжаных плянам.

Прытупленьне клясавай пільнасьці ў адносінах да варожых элемэнтаў асабліва выразна правялася ў справе Бялугі. Былы кіраўнік плянава-эканамічнага сэктару Белкаапсаюзу, перараджэнец, нацыянал-дэмакрат Бялуга ў радзе выпадкаў зацьвярджаў паасобным гандлюючым арганізацыям (менскі райспажыўсаюз, МЦРК, ЗРК «Пралетары», гомельскі ЦРК і інш.) выдаткі звароту да 13 і больш процантаў пры максымальным плянавым разьмеры ў 9,07 проц. Гэта выклікала павялічэньне выдаткаў па перасоўваньні тавараў да спажыўца.

Апарат Белкаапсаюзу ня выканаў дырэктыў партыі пра скарачэньне кіраўнічых выдаткаў. Разгортваньне гандлёвай сеткі не суправаджалася ўкараненьнем гаспадарчага разрахунку ва ўсе зьвенні кааперацыйнага апарату. Апарат разбухаў, механічна павялічваўся, зусім непрапарцыянальна росту агульнага тавараазвароту. Адсюль—зьніжэньне прадукцыйнасьці працы, рэзкае зьмяншэньне нагрузкі гандлёвых работнікаў, павышэньне выдаткаў на ўтрыманьне апарату да 5,37 проц. замест плянавых 3,5 процантаў.

Пытаньне аб барацьбе за танны шлях тавараў да спажыўца, за скарачэньне тавараправодзячай сеткі да апошняга часу не займала патрэбнага месца ў рабоце апарату спажывецкай кааперацыі. Барацьба за эканомнае выдаткаваньне дзяржаўных сродкаў не стаяла ў цэнтры ўвагі раду партыйных, гаспадарчых і прафэсіянальных арганізацый спажывецкай сыстэмы.

Зусім ня быў скарыстан мэтад фінансавага ўзьдзеяньня на тыя гандлюючыя арганізацыі, якія парушалі ліміты выдаткаў па асобных зьвеньнях і артыкулах.

Заданьні па скарачэньні выдаткаў звароту і нормы іх ня былі давядзены да крам, ларкоў і паасобных работнікаў прылаўку. Пытаньне максымальнага патаненьня тавараправодзячай сеткі ня стала неабходнай умовай сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў гандлёвым апараце.

Складаная часткай народна-гаспадарчага пляну зьяўляецца савецкая палітыка цэн. Яна дыктуе гаспадарчым арганізацыям задачу — дабіцца культурнага, рэнтабэльнага гандлю; узьняць прадукцыйнасьць працы, усямерна эканоміць сродкі. Многія кааперацыйныя арганізацыі, замест няўхільнага ажыцьцяўленьня савецкай палітыкі цэн, імкнуліся самавольным павышэньнем цэн прыкрыць сваё няўменьне гандляваць, зьменшыць выдаткі, пакрыць растраты і раскрадваньне сацыялістычнай маемасьці.

Некаторыя работнікі ЗРК, ЦРК, райспажыўсаюзаў і сельспажытаварыстваў, замест зьніжэньня выдаткаў і лепшай арганізацыі работы, незаконна павышалі прадажныя цэны, павялічвалі ўстаноўленыя націнкі. У выніку гэтага, ня гледзячы на надзвычай вялікія выдаткі, у мінулым годзе спажывецкая кааперацыя мела 3,8 проц. чыстага прыбытку, замест прадугледжаных плянам 1,6 проц.

Можна прывесьці рад фактаў, указваючых на няўпашасьць у кааперацыйным апараце спэкулянтаў, якія імкнуцца выехаць на рабочым спажыўцу, прыкрыць павышэньнем цэн свае жульніцкія махінацыі.

ЗРК фабрыкі «Камунарка» прадаваў сьвіное мяса па 11 руб. за кілё, замест прадугледжаных 7 руб. Плешчаніцкі райспажыўсаюз прадаваў жытнюю муку па 25 кап. клгр. замест прадугледжаных 15 кап.

Сталоўка № 2 дрысенскага гаспажыўтаварыства ўстанавіла націнку на цукар у разьмеры 442 проц. Загадчык крамы асіпавіцкага райсаюзу прадаваў ложкі па 55 руб. 30 к. замест 45 руб., жаночыя панчохі па 7 руб. 63 кап., замест устаноўленых 5 руб. 93 кап. Розьніцу ён прысвойваў сабе.

Белкаапшлодагародніна, атрымаўшы лімітныя цэны на грыбы вышэйшай якасьці ў 7 руб. 61 кап., фактычна прадавала іх па 15—20 руб. У выніку такіх спэкуляцыйных зьдзелак злачынна перабрана ў спажыўца звыш 500.000 руб.

Прывядзем яшчэ некалькі прыкладаў буржуазна-нэпманскіх скажэньняў савецкай палітыкі цэн у арганізацыях прамысловасьці і прамкаапэрацыі.

Менская база «ВЭО» адпускала рознае электраабсталяваньне гуртам па раздробных цэнах, а ў радзе выпадкаў і вышэй раздробных. Электралямпы, якія каштуюць 65 кап., прадаваліся па 78 кап. Тара коштам у 100 руб. адпускалася за 200 руб.

Гомельскае аддзяленьне саюзу палялічных закупіла ў Маскве розных тавараў гуртам па раздробных цэнах па суму 4.581 руб. і на гэтыя апэрацыі незаконна перабрала ў спажыўцоў 1.245 руб. Боты жаночыя прадаваліся па 28 руб. замест 23 руб., туфлі-дзіцячыя па 10 руб. замест 8 руб. і г. д.

У выніку спэкуляцыйна-гандлярскіх тэндэнцый з боку кіраўніка арцелі № 3 «Чырвоны інвалід» (Менск) Кажэўнікава, значная частка прадукцыі абівачнага цэху арцелі была рэалізавана з надзвычай вялікімі націнкамі: на канапу ў 112 руб., на матрац у 28 руб. Спажывец быў абкрадзен арцельцю на дзесяткі тысяч рублёў.

Ва многіх выпадках гандлюючыя арганізацыі згаджаліся на павышэньне цэн на паасобныя тавары, праведзенае прамкаапэрацыяй і дзяржаўнымі прадпрыемствамі. Грубыя скажэньні, якія мелі месца ў прамкаапэрацыі ў галіне цэн, зьлучаюцца часткова вынікам пагардлівых адносін спажывецкай кааперацыі да патрэб спажыўца, вынікам нэпманскага падыходу да пытаньняў гандлёвай работы.

Аб чым сьведчаць гэтыя факты? Яны сьведчаць аб тым, што ў кааперацыйны апарат пралезьлі клясава-варожыя элементы, якія імкнуцца падарваць работу кааперацыі, пагоршыць снабжэньне рабочага спажыўца. Спробы паасобных кааператараў парушыць савецкую палітыку цэн прадстаўляюць сабой поўную форму супраціўленьня клясавага ворага сацыялістычнаму будаўніцтву.

«Правда» ў перадавым артыкуле «Супроць спэкулянта за савецкім прыдаўкам» падкрэсьлівае, што мы маем тут справу са спэцыфічнымі формамі разлажэньня паасобных зьвеньняў гандлёвага апарату спэкулянтамі і жулікамі.

Выцясьненьне прыватніка накладзе асаблівую адказнасьць на нашу тавараправодзячую сетку ў галіне абслугоўваньня рабочых і калгасьнікаў. Усякім скажэньні савецкай палітыкі цэн, усякія спробы апартуністычных элементаў ігнараваць дырэктывы партыі павінны сустрэць самы рэзкі адпор.

Скажэньні савецкай палітыкі цэн маглі мець месца толькі таму, што партыйныя і савецкія арганізацыі не аднесьліся з патрэбнай увагай да гэтага важнейшага пытаньня, прайшлі міма фактаў павышэньня цэн. Усякае пасыўнае назіраньне буржуазных тэндэнцый у таваразвароце, ліберальныя адносіны да асоб, скажаючых палітыку партыі на важнейшым вучастку гаспадарчага будаўніцтва, аб'ектыўна зьяўляюцца дапамогай тым, хто скажае лінію партыі, хто на практыцы праводзіць спэкулянцка-нэпманскія тэндэнцыі.

Важнейшай умовай барацьбы за ўзорную гандлёвую работу, за выкараненьне нэпманскіх тэндэнцый зьяўляецца добра пастаўленая работа рэвізійных камісій. Трэба сказаць, што дагэтуль рэвізійныя камісіі праяўлялі поўную бязьдзейнасьць, не зварочвалі ніякай увагі на парушэньні савецкай палітыкі цэн, па злачыннае разбазарваньне дзяржаўных сродкаў. Рэвізійныя камісіі спажывецкай кааперацыі БССР у большасьці сваёй ня выканалі ўскладзеных па іх задач.

Перад рэвізійнымі камісіямі пастаўлена пытаньне рубам — яны нясуць адказнасьць за незаконнае павышэньне цэн, за празьмерныя прыбыткі, за павялічэньне выдаткаў звароту, паровіны з кіраўнікамі кааперацыйных арганізацый.

Вялікае значэньне набывае ачыстка гандлёвай сыстэмы ад чужых элемэнтаў. Трэба выгнаць з дзяржаўна-гандлёвага і кааперацыйнага апарату спэкулянтаў, жулікаў, якія падрываюць савецкі гандаль.

Барацьба з засьмечанасьцю гандлёвых кадраў, са зладзейскімі, жульніцкімі махінацыямі варожых элемэнтаў патрабуе перабудовы работы партарганізацый гандлёвай сыстэмы.

Партгрупы і парт'ячэйкі павінны ўзьняць клясавую пільнасьць, з максымальнай увагай адносіцца да работы свайго апарату. Ня можа весьці барацьбы са спэкулянтамі і растратчыкамі тая ячэйка, якая стаіць у баку ад вытворчага жыцьця, якая не змагаецца за лепшую арганізацыю гандлю, ня ведае свайго калектыву.

Рашучым ударам па нэпманска-спэкуляцыйных т

УСЕБЕЛАРУСКІ КОНКУРС ССТ

Раўненьне па лепшых ударніках каапэрацыі!

Змагаюцца за посьпех сяўбы

КЛІМАВІЧЫ. У пачатку красавіка ад былася нарада старшынь сельспажыўтаварыстваў Клімавіцкага раёну, якая пастанавіла ўключыцца ў конкурс на лепшае ССТ і ўзяла на сябе рад канкрэтных абавязацельстваў.

Уключыўшыся ў конкурс, некаторыя сельспажыўтаварыствы пачалі па-баяво му змагацца за посьпех сяўбы, падпачаліўшы гэтай задачы ўсю сваю дзейнасьць.

Раднянскае сельспажыўтаварыства за ключыла сацдагавор з калгасам «Чырвоны маяк». Выконваючы дагавор, каапэрацыя сыстэматычна высылае на поле разовую з прамтаварамі. Калгас забясьпечваецца коламазьзю і с.-г. інвэнтаром. Арганізаваны чорная і чырвоная дошкі пры крамах, куток ударніка, наладжан выпуск насьценгазэты.

Паводле дагавору калгас абавязаўся выкананць плян сяўбы ў тэрмін, правесьці ўсе патрэбныя агрэмерапрыемствы, дапамагчы сельспажыўтаварыству засеяць яго зучастак.

Змагаецца за посьпех сяўбы і пазовіцкае сельспажыўтаварыства. Заключана 17 дагавораў з брыгадамі і калгасамі на лепшае праведзеньне сяўбы. Быў арганізован выезд разовай у брыгады № 5-6 калгасу «Камінтэрн». Найбольшую колькасьць прамтавараў адрымалі лепшыя ўдарнікі—калгасьніца Анюта Багданава і брыгадзір Вінтар Кашынскі.

Быў праведзен таксама выезд разовай ў брыгаду тав. Сямёнкі—перадавую брыгаду калгасу імя Сталіна. А. К.

ПРЫКЛАД КАЗЁННАГА ФАРМАЛІЗМУ І БЯЗЬДЗЕЙНАСЬЦІ

РЭЧЫЦА. Рэчыцкі райсаюз яшчэ ў пачатку красавіка абмеркаваў пытаньне аб конкурсе ССТ на пасяджэньні праўленьня. Была склікана нарада старшынь спажыўтаварыстваў. У сельсаветы былі спушчаны інструкцыі аб практычным правядзеньні конкурсу. На гэтым райсаюз прызнаў сваю місію скончанай і спыніў далейшую работу. Ён не забясьпечыў кіраўніцтвам ход конкурсу, не наладзіў кантролю выкананьня.

Зразумела, што пры такім фармальным падыходзе да важнейшага пытаньня перабудовы работы спажывецкай каапэрацыі ня можа быць дасягнута значных посьпехаў. І сапраўды, па 26 сельспажыўтаварыствах і 125 калгасах Рэчыцкага раёну заключана толькі 47 дагавораў. Не заключана ніякіх дагавораў з аднаасобнікамі, ніякай работы ў гэтай галіне сельспажыўтаварыствы не правялі.

Ёсьць разовыя ларкі, але з-за адсутнасьці патрэбнага асартымэнту тавараў і транспарту яны не працуюць.

Нічога ня зроблена, каб арганізаваць грамадзкае харчаваньне ў полі.

У некаторых сельспажыўтаварыствах вывешаны чорныя і чырвоныя дошкі, але яны не абнаўляюцца і таму не даюць правільнага малюнку ходу пасеўнай.

Спажывецкая каапэрацыя Рэчыцкага раёну ігнаруе задачу разгортваньня таваразвароту. Досыць прывесьці такі прыклад: з-за адсутнасьці сродкаў тавары не выкупляюцца па 15 дзён.

Тавар у нізоўку завозіцца бяз усякага ўліку патрабаваньняў пайшчыкаў. У Горвальскім сельспажыўтаварыстве больш трох месяцаў ляжыць дарагі жаночы шаўковы трыкатаж (па 100—110 руб. сукенка), хінная вада і інш. няходкія тавары. У крамах іншых ССТ ляжыць няходкіх тавараў, якія трэба пераацаніць, на 20.000 руб.

Ясна, што пры такой сыстэме гандлю ня можа быць ніякай гутаркі аб паляпшэньні тавараснабжэньня вёскі, аб пераважным снабжэньні лепшых калгасаў і аднаасобнікаў.

Рэчыцкі райсаюз павінен неадкладна перабудаваць сваю работу, уключыцца ў конкурс не фармальна, а пабаявому, разгарнуць сапраўднае спаборніцтва паміж сельспажыўтаварыствамі, работнікамі прылаўку і каапактывам. Трэба аддаць значную ўвагу аднаасобнаму сэктару, які займае ў раёне 70 проц.

Айзэнштадт.

ПАДПІСАНА І З ПЛЕЧ ДАЛОЎ

БУДА-КАШАЛЕВА. Да апошняга часу буда-кашалеўскі райсаюз нічога не зрабіў у галіне абслугоўваньня пасеўнай кампаніі, не арганізаваў конкурсу на лепшае сельспажыўтаварыства.

Райсаюз абмежаваўся тым, што паслаў у нізоўку пару цыркуляраў; ён не наладзіў штодзеннага апэрацыйнага кіраўніцтва работай спажывецкай сыстэмы.

Абсьледваньне работы раду спажывецкіх таварыстваў паказала, што райсаюз зусім не ўсьвядоміў той адказнасьці, якую нясе каапэрацыя, за абслугоўваньне пасеўнай кампаніі.

Былі абсьледаваны Буда-Люшаўскі і Забоўскі сельсаветы. Выявілася, што спажыўтаварыствы гэтых сельсаветаў зусім не абслугоўваюць пасеўнай. Яны ня ведаюць аб тым, як ідзе сяўба, якія калгасы ідуць уперадзе і хто адстае.

Важнейшым вагаром стымуляваньня пасеўнай зьяўляецца правільна арганізаваны таваразварот. Аднак, буда-кашалеўскі райсаюз дапусьціў рад скрыўленьняў дырэктыў партыі пра разгортваньне таваразвароту. **Фактычныя рэшткі тавараў перавышаюць нармальныя на 15 дзён.**

Амаль усе тавары ў крамах ССТ забраніраваны. Райзаг мае спэцыяльную прамтаварную базу і адпускае тавары сельспажыўтаварыствам выключна для тавараабмену. На базе райсаюзу ёсьць выстарчальная колькасьць газы і коламазі, а ў спажывецкіх таварыствах гэтых тавараў няма. Пайшчыкі прымушаны езьдзіць у Гомель купляць гэтыя тавары на рынку і плаціць у пяць раз даражэй.

Поўную бязьдзейнасьць праявіла спажывецкая каапэрацыя ў галіне разьвіцьця адкормачных апэрацый. Плян уласных пасеваў сарваны. Пры заданьні на 100 га кормапалёў, райспажыўсаюз дабіўся адводу плошчы ў 50 га, а загатовіў насеньня толькі на 20 га.

Кіраўніцтва спажывецкай каапэрацыі Буда-Кашалёўскага раёну імкнецца тлумачыць сваю бязьдзейнасьць тым, што раённыя арганізацыі мабілізоўваюць каапэрацыйных работнікаў на іншыя кампаніі. Гэта яўная хлусьня. Райсаюз паваг ня ставіў пытаньне аб конкурсе ў РК і РВК. Калі прыехаўшы прадстаўнік Белкаапсаюзу паставіў гэта пытаньне на бюро РК, дык раённыя арганізацыі адразу-жа пайшлі насустрач, мабілізавалі ўвесь кіруючы склад райсаюзу на правядзеньне конкурсу на лепшае ССТ.

Праўленьне райсаюзу павінна быць прыцягнута да адказнасьці за праяўленую бязьдзейнасьць.

Ваўкавіцкі.

У цэнтральнай конкурснай камісіі

* На апошнім пасяджэньні цэнтральнай конкурснай камісіі быў заслуханы даклад рагачоўскага райсаюзу, цяхініцкага і пабалаўскага сельспажыўтаварыстваў аб абслугоўваньні пасеўнай. Каапэрацыя Рагачоўшчыны першай уключылася ў конкурс і правяла рад каштоўных мерапрыемстваў. Асаблівых посьпехаў дасягнула цяхініцкае ССТ.

Цэнтральная конкурсная камісія выз. начыла цяхініцкае сельспажыўтаварыства кандыдатам на пяршынства ў конкурсе.

* Цэнтральная конкурсная камісія выехала ў Полацак, дзе абдудзецца пасяджэньне з удзелам прадстаўнікоў раду раёнаў. На пасяджэньні будуць заслуханы даклады аб рабоце спажывецкай сыстэмы Полацкага, Асьвейскага, Расонскага і інш. раёнаў.

ПРА ЗЬМЕНУ п. „б“ АРТ. 3 ПАСТАНОВЫ ПРА ЗБОР НА ПАТРЭБЫ ЖЫЛЬЛЕВАГА І КУЛЬТУРНА-БЫТАВОГА БУДАЎНІЦТВА У ГАРАДОХ І СЕЛЬСКІХ МЯСЦОВАСЬЦЯХ НА 1933 ГОД

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту і Савету Народных Камісараў БССР

Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць запісаць п. «б.» арт. 3 пастановы ЦВК і СНК БССР ад 3 лютага 1933 году «Пра збор на патрэбы жыльлёвага і культурна-бытавога будаўніцтва ў гарадох і сельскіх мясцовасьцях на 1933 год» (ЗЗ БССР 1933 г., паст. 11) у наступнай рэдакцыі:

«б) асобы, узнагароджаныя ордэнамі Саюзу ССР ці ганаровай рэвалюцыйнай зброяй, і героі працы».

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР М. ГНІЛЯКЕВІЧ.

КАГО-Ж АБСЛУГОЎВАЕ ВУЗЬДЗЕНСКІ РАЙЗЕМАДДЗЕЛ?

Правільны севазваротмагутны сродак для ўзьнятьня ўраджайнасьці. Але ў Вузьдзенскім райземаддзеле, відавочна, прытрымліваюцца іншай думкі. Во чым інакш можна тлумачыць, што з 80 калгасаў севазвароты ўведзены толькі ў 8?

60 севазваротаў, запраектаваных у калгасах, вось ужо два месяцы ляжаць у райземаддзеле неразгледжанымі і незацьверджанымі. Райаграном Гляцэвіч усё адкладвае гэту справу.

Такое становішча з вытворча-фінансавымі плянамі калгасаў. Ні адзін плян яшчэ не зацьверджан. Між тым у радзе калгасаў пляны складзены па-шкодніцку. Напрыклад, у калгасе «Новы быт» запраектавалі атрымаць ураджай: жыта 6 цэнтн. з гэктара, аўса па 4 цэнтн., ільну—1,7 цэнтн. У калгасе «Пралетары» запраектавалі атрымаць збожжавых... па 2 цэнтн. з га. На гэтыя кулацкія вылазкі райземаддзел не рэагуе.

У Палашанскім і Прысынкаўскім сельсаветах многім аднаасобнікам яшчэ не адведзена зямля. Мімаволі паўстае пытаньне: каго-ж абслугоўвае Вузьдзенскі райземаддзел і чым наогул заняты яго работнікі зараз, у самы адказьнейшы момант пасеўнай? Л. К.

Увага падсочцы сасны

Падсочка дае залатое малако сасны—жывіцу, якая выяўляецца надзвычай каштоўным сырцом для экспарту.

Разьвіцьцё падсочкі хвоі ў БССР ёсьць барацьба за вываленьне нашай прамысловасьці ад капіталістычнай залежнасьці і за павялічэньне экспарту.

Жывіца, якая атрымліваецца пры падсочцы, пасьля перапрацоўкі дае каніфоль і высокаякасны бальзам-шкіпінар.

Каніфоль нашай прамысловасьці вялікімі патрэбен для электрызаляцыі, праклейкі паперы, матэрыі, для выпрацоўкі мыла, заліўкі электрадаў і інш.

Бальзам-шкіпінар патрэбен для выпрацоўкі сынтэтычнага каўчука, лякаў і фарбаў, для лекавых патрэб і парфумэрыі.

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі Расія ўвозіла як каніфоль, так і бальзам-шкіпінар пераважна з Францыі і Амэрыкі, бо маўлы месца на поўначы ня ніякі падсочны прамысел даваў у год толькі да 200 тон жывіцы.

У пераважнай частцы лясных спэцыялістаў таго часу склалася няправільная думка, што нашы сасны не даюць жывіцы, тое-ж даводзіў і сусьвет ны вучоны, прафэсар **Дзюпон**, які на карысьць францускім капіталістам на тэгарычна зазяўляў, што ў Расіі зда быць жывіцу з-за клімаціччных умоў нельга, бо нашы сасны жывіцы не даюць.

Рабочая клясна, пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі, з коранем выр вала гэтыя шкодніцкія, рэакцыйныя настроі.

Разьвіцьцё падсочкі ў СССР, у тым ліку і БССР у першым пяцігодзьдзі паказала, што падсочка ў нас мае важнае эканамічнае значэньне.

Маючы да 50 мільёнаў га сасновых прэвастанаў па СССР і ў тым ліку да мільёну га па БССР, мы ня толькі зможам забясьпечыць цалкам нашу прамысловасьць каніфолью і бальзам-шкіпінарам, а адначасова да мо значную колькасьць гэтай прадукцыі на экспарт. Так, да рэвалюцыі было здабыта на ўсёй Расіі да **200** тон жывіцы, а зараз, на працягу першай пяцігодкі, толькі ў адным БССР атрымана **10,883** тоны. Зараз Савецкі саюз з апошняга месца па здабычы жывіцы арэнды значную колькасьць капіталістычных краін і заняў трэцяе месца на сусьветным рынку і першае пасьля Амэрыкі і Францыі.

У першым годзе другой пяцігодкі перад трэстам **Белхімлесу**, які займаецца здабычай жывіцы, пастаўлена задача здабыць жывіцы **6.018** тон, што патрабуе ўстаноўкі **12.200** тыс. прыёмнікаў, **3.660** чал. рабочых і **1.220** чал. тэхнэрсаналу.

Тэхніка падсочкі заключаецца ў тым, што растучаму дрэву-сасьне, спэцыяльным вострым інструмантам стамескай ці чым іншым робіцца зрэз по перак дрэва, глыбінёй да 1 см. і шырынёй да 16 см.

Пры гэтым зрэзе ў дрэве пераразаюцца так званыя смоляныя хады, з якіх выцякае жывіца. Выцякаючая жывіца з смоляных ходаў попадае ў падстаўлены пад падрэз прымальнік.

З тэй прычыны, што пасьля зрэзу выступаючая жывіца на зрэзе пад уплывам паветра і сонца засыхае і не дае магчымасьці попадаць у прымальнік жывіцы, што знаходзіцца ў смоляных ходах дрэва, то праз кожныя 3 дні неабходна зрэзы падпаўняць. Гэту працу выконваюць рабочыя-ўздымшчыкі.

Пачатак выцяканьня жывіцы з дрэва пачынаецца, у залежнасьці ад надвор'я, з 25 красавіка і заканчваецца да сезон падсочкі канец 1-15 кастрычніка. За сезон робіцца да 40 уздымак, што дае з аднаго дрэва 1-1,5 кгр. жывіцы, ці 450-500 прамаў жывіцы на адзін прымальнік.

Зразумела, што тэхніка падсочкі, праваджэмая ў нас па нямецкім спосабе, стаіць яшчэ на прымітыўнай ступені. Задача рабочых, тэхнэрсаналу промысловаў у бліжэйшы час, шляхам рацыяналізацыі і вынаходзтва, палепшыць гэтую тэхніку з тым, каб яе механізаваць. У гэтым годзе наукова-даследчае таварыства лясной і лесахімічнай прамысловасьці ўзяла на сябе абавязак дабіцца больш інтэнсыўнай тэхнікі.

У мінулым годзе, ня гледзячы на добрае надвор'е, значная колькасьць раёнаў пачалі падсочку са спазьненьнем, мясцамі на цэлы месяц.

Кожны прапушчаны дзень, кожны позьні зрэз, кожны прагул ніякай тэхнікай і шпурмам у далейшым ня зможа быць пакрыт. Тое, што магчыма атрымаць сёньня з дрэва, атрымаць заўтра пры сучаснай тэхніцы немагчыма.

Таму, на падсочцы, як нідзе ня мо гуць мець месца—позьні пачатак працы. Гэта павінен сабе добра ўсьвядомець як рабочы падсочку, так і тэхнэрсанал.

У гэтым годзе як нікоі стаіць пытаньне аб выкананьні якасных паказальнікаў па падсочцы.

Пастанова спэцыяльнага пленуму ЦК і ЦКК УсеКП(б) на промыслах па вінна быць поўнасьцю выкананая.

Дабіўшыся колькасных паказальнікаў—па асваеньні падсочкі лясных масываў і ўстаноўкі **12.200** тыс. прымальнікаў на плошчы **46** тыс. га,—перад рабочымі і тэхнэрсаналам падсочкі пастаўлена задача асвоіць праектную магутнасьць кожнага прымальніка і даць у сярэднім ня менш **70** прам жывіцы з прымальніка.

У той час, як ў мінулыя гады мы дапускалі пазьнішасьць у жывіцы сьмецця і вады, што адбілася на працы заводаў, то зараз гэтага дапусьціць нельга, мы павінны даць асабліва добраякасную жывіцу, гэта значыць без сьмецця і вады і з тым, каб яна мела ў сабе магчыма больш бальзам-шкіпінару.

Дабіцца **50** проц. жывіцы экспартнай якасьці, г. зн., каб яна мела ня менш **1** проц. сьмецця і ня больш **4** проц. вільгаці—вось задача, якую павінен у гэтым сэзоне пастаўіць перад сабой кожны рабочы і тэхнічны работнік промыслу.

Таксама ня менш важная задача,—гэта дабіцца такой жывіцы. Тое зьвяшчэ, якое мела месца ў мінулым годзе, калі суперцэ тлумачэнга сабекошту ў **630** руб. за тону, тона жывіцы каштавала фактычна да **900** руб., ні ў гэтым разе ў гэтым годзе не павінна быць дапушчана.

Брыгадны мэтад працы з стварэньнем брыгады з 4-х уздымшчыкаў, 2-х выбарнікаў, павінен быць праведзен на промыслах абавязкова, бо толькі ён забясьпечыць належную прадукцыйнасьць працы і забясьпечыць выкананьне ня толькі колькасных, але і якасных паказальнікаў плянаў.

Неабходна, каб раённыя арганізацыі і сельскія саветы з пачатку сэзона ўзялі пад належны кантроль, і стварылі сталую дапамогу гэтай справе з тым, каб забясьпечыць выкананьне пляну здабычы жывіцы ў першым годзе другой пяцігодкі.

П. Лазарэвіч.

У ПРЭЗЫДЫУМЕ ЦВК БССР

* Арганізацыя грамадзкага харчаваньня ў МТС, саўгасах і калгасах на час сяўбы і ўборачнай кампаніі праходзіць нездавальняюча. З 59 МТС БССР толькі 39 маюць свае сталоўкі.

Большасьць саветаў і райвыканкомаў, праходзіць мімо пытаньня аб наладжаньні грамадзкага харчаваньня ў саўгасах, МТС і калгасах. Белкаапсаюз і Белкаапхарч не праяўляюць выстарчальнай настойлівасьці ў замацаваньні і па ляпшэньні работы існуючых сталовак, у забесьпячэньні іх неабходным інвэнтаром, кадрамі, далейшым разгортваньнем сеткі новых сталовак.

Прэзыдыум ЦВК абавязаў усе райвыканкомы і саветы ўключыць у плян сваёй штодзённай работы арганізацыю грамадзкага харчаваньня ў МТС, саўгасах і калгасах, мабілізаваўшы праз сэкцыі і дэпутацкія групы пралетарскую грамадзкасьць на барацьбу за паляпшэньне гэтай справы.

Важнейшая задача Наркамзему, райзе мадделаў, райвыканкомаў, сельсаветаў і кіраўніцтва калгасаў—арганізаваць грамадзкае харчаваньне ў калгасах з падвозам яды непасрэдна на поле, у брыгаду, асабліва ў тых выпадках, калі брыгада працуе на значнай адлегласьці ад месца жыхарства калгасьнікаў.

Прэзыдыум ЦВК вызначыў таксама рад мерапрыемстваў па паляпшэньні снабжэньня сталовак, разгортваньні звышплянавых загатовак, мабілізацыі ўнутраных рэсурсаў і г. д.

Адначасова кіраўнікі саўгасаў і калгасаў папярэджаны, што вызначэньне прадуктаў харчаваньня не павінна рабіцца за лік тэй таварнай прадукцыі, якая павінна быць здана дзяржаве.

Прэзыдыум ЦВК прапанаваў Наркамзему, Наркамсаўгасаў разам з Белкаапхарчам арганізаваць узорную пастаноўку грамадзкага харчаваньня ў радзе перадавых калгасаў і саўгасаў, якія своячасова выканалі свае абавязацельствы перад дзяржавай па здачы с.-г. прадукцыі і лепш падрыхтаваліся да сяўбы. Гэта работа павінна быць праведзена ў першую чаргу ў **Копыльскім, Бягомльскім, Дзяржынскім, Вузьдзенскім і Лепельскім раёнах.**

* Улічваючы, што адным з галоўных мерапрыемстваў матар'яльнага паляпшэньня работы дзіцячых дамоў зьяўляецца стварэньне ўластай харчовай базы пры іх, прэзыдыум ЦВК БССР пастанавіў адпусьціць на гэту мету са сродкаў цэнтральнай дзіцячай камісіі 200 тыс. руб.

Райвыканкомам даручана прасачыць за правільнасьцю выкарыстаньня гэтых сродкаў і аказаць усямерную дапамогу ў створаньні харчовай базы дзіцячых дамоў шляхам забесьпячэньня засеву гародаў цягавай сілай, насеньнем і г. д.

Аб ахове пасеваў у каапгасах

Пастанова ЦСПСБ

У сувязі з выяўленымі фактамі раскрадваньня пасеянага насеньня бульбы і ўлічваючы леташнія выпадкі па кражы гародніх культур, патраў пасеўных плошчаў і сенажаці, псаваньне культур праездам, прагонам жывёлы і сьвя домае злачынства ў зьнішчэньні пасеўных культур клясавымі ворагамі, прэзыдум ЦСПСБ пастанаўляе:

1. Абавязаць дырэктароў усіх каапгасаў забясьпечыць ахову палёў у пры гарадных гаспадарках вартаўнікамі з лепшых рабочых, праверанымі ударнікаў. Рабачкомам каапгасаў паглыбіць палітычна-выхаваўчую працу сярод рабочых каапгасаў, гэтым самым узмацніць іх клясавую пільнасьць у ахове каапгасных палёў.

2. Прапанаваць ФЗМК, якія маюць прыгарадныя гаспадаркі, устанавіць рэгулярнае дзяжурства рабочых ударнікаў асобных шэфствуючых цэхаў на палёх сваіх вучасткаў у каапгасах у парадку грамадзкасьці і за кошт адпрацоўкі працадзён, згодна пастановы прэзыдыуму аб скарыстаньні рабочых у прыгарадных гаспадарках.

ПА САВЕЦКАЙ БЕЛАРУСІ

Новыя мэтады лячэньня

За апошні час увага пралетарскай грамадзкасьці і асабліва навуковых работнікаў і дактароў Масквы і Ленінграду прыцягвае пытаньне аб новых мэтадах лячэньня хвароб.

Найбольшай увагі заслугоўвае мэтад лячэньня хвароб гэтак званымі лізатамі, г. зн. прадуктамі распаду бялковай малекулы розных органаў і тканін.

Мэтад прапанован прафэсарам усесаюзнага інстытуту эксперымэнтальнай медыцыны Тушновым і маладым савецкім дактарам Казаковым. Апошняму ўдалося дасягнуць бліскучых практычных вынікаў ужываньнем «лізатаў» пры радзе захворваньняў, асабліва хвароб унутранай сэкрэцыі, абмену матэрый і розных функцыянальных парушэньняў нервовай сыстэмы.

У Маскве ўжо адкрыт вялікі навукова-дасьледчы інстытут на чале з дактарам Казаковым. Пры інстытуце—клініка на 150 ложак па вывучэньні праблемы і праверцы дзейнасьці лізатаў.

Група дактароў—навуковых работнікаў Менску мяркуе паставіць перад Наркамаховы ахароўя БССР пытаньне аб азнаямленьні з новымі мэтадамі лячэньня.

Доктар Казакоў даў згоду на ўключэньне ў адну з сваіх брыгад групу работнікаў другой тэрапэўтычнай клінікі Белмэд'інстытуту.

Нядаўна на агульным сходзе менскіх дактароў быў заслуханы першы дакład па гэтым пытаньні—доктара Ліпеца, навуковага работніка другой тэрапэўтычнай клінікі Белмэд'інстытуту.

Самаправерка апарату МГРК

Менскі ГРК правёў месячнік самаправеркі апарату. Выяўлен рад фактаў растрат, раскрадваньня каапэрацыйнай маёмасьці, п'янак і г. д. Паасобныя вывешы МГРК аказаліся засьмечанымі клясава-чужым элемэнтам. Так, у разьмеркавальніку № 19 працавала дачка кулака Пагоцкая. Бацькі яе раскулачаны і высланы за межы БССР. У загадчыка крамы № 16 Вайца выяўлена недастача грошай каля 7.000 руб. Загадчык крамы № 39 Кананевіч—п'яніца і хуліган. За хуліганства ён асуджан да 1 году прымусовых работ. Шмат у апараце былых гандляроў.

У выніку самаправеркі 15 работнікаў МГРК аддаены пад суд. Зьняты з работы ў каапэрацыйным апараце 44 ралавекі, з іх 29 загадчыкаў крам, баз, складаў і 13 работнікаў прылаўку.

Выдача пашпартоў у Слуцку

СЛУЦАК.

У горадзе і па сельсаветах з 13 мая пачынаецца выдача пашпартоў працоўнаму насельніцтву. Арганізавана 19 пунктаў.

На мясцох разгарнулася масавая работа вакол выдачы пашпартоў. Пры кожным сельсавеце з калгаснага актыву створана брыгада садзейнасьці. Выдача пашпартоў скончыцца па рабіне да 1 чэрвеня. (Белта).

Прыезд акадэміка Вавілава

Па запрашэньні Акадэміі Навук Беларусі ў Менск прыяжджае прэзыдэнт усесаюзнай акадэміі сельска-гаспадарчых навук імя Леніна акадэмік ВАВІЛАЎ. Акадэмік ВАВІЛАЎ выступіць з докладам аб сваёй паездцы ў Паўднёвую Амэрыку.

Тав. Варэньнік брыгадзір чырвонасьцяжнай брыгады (зав. імя Варашылава).

Вытворчая мастацкая кінаканфэрэнцыя

У Менску намечана склікаць усебеларускую вытворча-мастацкую кінаканфэрэнцыю. Канфэрэнцыя абгаворыць пытаньне аб нацыянальна-культурным будаўніцтве БССР і задачах беларускай савецкай кінаматаграфіі, аб вытворчым пляне ленінградзкай кінафабрыкі «Савецкая Беларусь» і падрыхтоўцы да тэматычнага пляну на 1934 год.

Асаблівая ўвага будзе аддана пытаньню аб прыцягненьні літаратурных сіл БССР для работы на фронце кіно.

У рабоце канфэрэнцыі прымуць удзел прадстаўнікі літаратурных гурткоў і рабочы актыў Менску.

Беларускі маладзежны тэатр сатыры і камэдыі

Калегія Наркамасьветы вызначыла рад мерапрыемстваў па карэннай перабудове і паляпшэньні работы БелТРАМ'у. Апошні рэарганізуецца ў Беларускі маладзежны тэатр сатыры і камэдыі. Асаблівая ўвага будзе аддана п'есам маладзежнай тэматыкі.

Уся работа тэатру павінна быць падпарадкавана інтэрнацыянальным прынцыпам, маючы на ўвазе абслугоўваньне нацменшасьцяй БССР. Кіраўнікамі запрашаюцца лепшыя мастацкія сілы Менску і ў прыватнасьці ВДТ-1, яўрэйскага і інш. тэатраў.

У сучасны момант тэатр пераключаецца на грунтоўную студыйную вучобу, якая павінна забясьпечыць працэс перабудовы тэатру і мабілізацыю яго на выкананьне пастаўленых перад ім задач.

Узьнята пытаньне аб перадачы БелТРАМУ спэцыяльнага будынку.

Летняя аздаравіцельная кампанія

20 тысяч піянэраў будуць гэтым летам накіраваны ў масавыя лягеры. Апошнія арганізуюцца ў 36 раёнах БССР. У Менску, Гомелі, Віцебску, Бабруйску, Магілеве арганізуюцца санаторныя піянэрскія лягеры, якія ахопяць 3 тысячы чалавек. Адкрыцьцё масавых і санаторных піянэрскіх лягераў адбудзецца 1 чэрвеня. Тэрмін прабываньня ў іх—30 дзён.

Прэзыдыум ЦСПСБ вызначыў рад мерапрыемстваў па мэдычным і культурным абслугоўваньні лягераў. Адпачынак настаўніцтва будзе так прыстасаван, каб пэўную частку настаўнікаў можна было прыцягнуць да работы ў піянэрскіх лягерах і інш. аздаравіцельных установах.

Фізкультура

* 20 мая ў садзе **«Прафінтэрн»** адбудуцца **гарадзкія тэнісныя спаборніцтвы** па трох клясах. У спаборніцтвах прымуць удзел лепшыя тэністы Менску.

* 23 мая на ўсебеларускім стадыёне —гарадзкія **школьныя спартакіяды** па ўсіх відах гімнастыкі і лёгкай атлетыцы.

* 30 мая на фізкультурнай пляцоўцы саду «Прафінтэрн» адбудуцца гарадзкія спаборніцтвы **па валейболу і гарадках.**

* 6 чэрвеня намячаецца правесьці агульна-гарадзкія спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы і вэлёсыпэдная язьдзе.

* 12 чэрвеня на цэнтральным стадыёне — **усебеларускія цяжка-атлетычныя спаборніцтвы.** Пераможцы будуць накіраваны для ўдзелу ва ўсесаюзных цяжка-атлетычных спаборніцтвах.

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

11-га мая а 7 гадз. увечары ў памяшканьні Дому Камасьветы (рог Энгельса і К. Маркса) адбудзецца рэдактароў шматтыражак і насьценгазэт гораду.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

Чырвоная Зорка. Каса адкрыта ад 1 гадз. Замежны мастацкі фільм **Востраў крушэньняў** драма ў 6 частках. **ДЗЕННЫЯ СЭАНСЫ ЗЬМЕНА РАСЬЦЕ**

Дзіцячы гукавы **КІНО-ТЭАТР** Каса з 1 г. дня. **ВЯЧАРНІЯ СЭАНСЫ РУБІКОН**

Інтэрнацыянал. Амэрыканскі прыгодніцкі фільм **ХУТКІ**

Кіно „ПРАЛЕТАРЫ“. Новы замежны фільм **МАГАРАДЖА**

КІНО „СПАРТАК“ З 10 мая Выдаты замежны фільм **БАЯЗЬЛІВЕЦ** Камэдыя ў 7 частках. Штодзенна 5 сэансаў. Каса—з 2 г. 30 м.

Згублена круглая пячатка МК Саюзлесасьбыту. Лічыць несапраўдным.
Згублена круглая пячатка Кайкаўскага сельпо Сьмілаўскага раёну. Лічыць несапраўдным.
Згублена круглая пячатка Семахвал. шавецк. арцелі „Пралетары“. Лічыць несапраўдным.
Згублен штамп крамы № 19 МТСТ. Лічыць несапраўдным.

На падставе распараджэньня СНК СССР ад 9-III-33 г.,
Плешчаніцкі лесрабкоп
ліквідуецца.
Усе ўстановы і асобы, якія маюць прэтэнзіі да Плешчаніцкага лесрабкопу, павінны прад'явіць іх ліквідкому
не пазьней 15 мая,
пасьля якога тэрміну паступіўшыя прэтэнзіі разглядацца ня будуць.
Ліквідком.

12-га мая, а 7 гадзіне ўвечары рэдакцыя газэты „Зьвязда“ склікае пашыраную
НАРАДУ
ПА ПЫТАНЬНІ СТАБІЛЬНАГА ПАДРУЧНІКУ І НАВУЧАЛЬНЫХ ПРАГРАМ ДЛЯ МАСАВАЙ ШКОЛЫ.
На нараду запрашаюцца т. т.: **Браўковіч** (ДВБ), **Бялуга** (НКА), **Баршчэўская** (ДВС), **Бранэйзін** (дырэктар друкарні імя Сталіна), **Вадэйка** (гарком саюзу працасьветы,) **Родава і Цёмкіна** (ЦП саюзу працасьветы), **Яськевіч і Зяньневіч** (Гарана). **Стронгіна, Гененскі** (7-я школа), **Млынскі** (8-я школа), **Цмых, Гуліс, Каган** (25-я школа), **Гальпэрын** (27-я школа), прадстаўнік ЦК ЛКСМБ, рэдактар часопісі „За камуністычнае выхаваньне“, прадстаўнік БАКТу.
На нараду запрашаюцца зўтары, якім даручана пісаць падручнікі, жадаючыя настаўнікі, студэнты, работнікі працасьветы.
Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэд. „Зьвязда“.
РЭДАКЦЫЯ.

Дзяржаўнае акцыянэрнае Таварыства **„ІНТУРЫСТ“**
ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО ЯНО БЯРЭ НА СЯБЕ СПРАВУ
АФАРМЛЕНЬНЯ ДАКУМАНТАЎ ДЛЯ ВЫЕЗДУ З СССР ЗАГРАНІЦУ
для тых, хто жадае на сталае жыхарства выехаць заграніцу.
Усе выдаткі па афармленьню дакумантаў і абслугоўваньню пасажыраў прымае у замежнай валюце „ІНТУРЫСТ“
Цана пашпарту: для працоўных **500 руб.,** для грамадзян іншых катэгорый **—1000 р.**
Усе даведкі аб выезьдзе на сталае жыхарства заграніцу можна атрымаць **у канторах і аддзяленьнях „Інтурыст“** па ніжэйпаказаных адрасох або непасрэдна ў праўленьні „Інтурыст“
ПА АДРАСЕ:
гор. Москва, ул. Горького, 11, гостиница „Национал“, пассажирское управление „ИНТУРИСТА“.
АДРАСЫ аддзяленьняў „Інтурыста“ ў наступных гарадох:
ЛЕНИНГРАД—ул. Ласаля, дом 1, гостиница „Европа“.
Н. НОВГОРОД—Советская пл., гостиница „Россия“.
СТАЛИНГРАД—ул. Гоголевская, д. 5, гостиница „Люкс“.
СЕВАСТОПОЛЬ—ул. К. Маркса, д. 32.
ЯЛТА—Ленинская ул., гостиница „Ленинград“.
РОСТОВ-ДОН—ул. Энгельса, д. 55.
ХАРЬКОВ—Пл. Тевелева, д. 30.
КИЕВ—ул. Карла Маркса № 5 гостиница „Континенталь“.
ОДЕССА—Пушкинская, дом 15, гостиница Червонная.
МИНСК—Комсомольская, 20.
ВЛАДИВОСТОК—Пр. 25 Октября—гостиница „Золотой Рог“
ТИФЛИС—ул. Руставели, гостиница „Ориент“.
БАКУ—ул. Малыгина, гостиница „Новая Европа“.
БАТУМ—Кутайская ул. №6, гостиница „Интернационал“.

Рэдакцыя газэты „ЗЬВЯЗДА“
склікае **СЁНЬНЯ** а 7 гадзіне ўвечары
ПАШЫРАНУЮ НАРАДУ
ПА ПЫТАНЬНЯХ
дарожнага будаўніцтва.
На нараду запрашаюцца з адпаведнымі матар'ялямі аб стане падрыхтоўкі да дарожнага будаўніцтва адказныя прадстаўнікі: НКВД, НКСаўгасаў, ад галоўдартрансу: **ФРУМКІН, ІВАНОЎ, ХАЙКІН, ГРЭЗНЭР, ГОХФЭЛЬД ГОРДЗІН, ТУРКІНІЧ** ад транспартнага сэктару ЦК КП(б)Б, ад транспартнага сэктару ЦКК-НК РСІ, ад ЦК ЛКСМБ ЦС Аўтадору тав. **АКІШЧЫН**, прадстаўнікі ЦСПСБ, Трактарацэнтраў Дарнаапсэкцыі ЦП дарожнікаў і іншых зацікаўленых устаноў і арганізацый.
Нарада адбудзецца ў памяшканьні рэдакцыі Савецкая, 83, трэці паверх, пакой № 1.

13-V—33 г., у 7 г. вечара, у Доме Тэхнікі (Камсамольская, 25)
РБІТС лесу і сплаву і аргбюро НІТТ лясной і лесахімічнай прамысловасьці
арганізуюць **ДАКЛАД** на тэму:
„Прынцыпы лесакарыстаньня на даным этапе сацыялістычнага будаўніцтва і крытыка буржуазна-шкодніцкіх тэорый Марозава, Арлова і інш.“
—Дакл. навук. прац. Бел. НДІ **Касьцюновіч**
Яўка членаў ІТС і НІТТ гор. Менску абавязкова.
Уваход вольны.
РБІТС і аргбюро НІТТ.

Дзяржаўнаму